ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

4 ЧЭРВЕНЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 104 (27962) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Непаўналетнім уваход забаронены!

«Сакрэтныя» тэхналогіі ЦТ

Фатограф, які бачыць душой

УЗРОВЕНЬ, АДПАВЕДНЫ ПАТЭНЦЫЯЛУ

Наша краіна гатова будаваць больш глыбокія і шырокія адносіны з Індыяй

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з Прэзідэнтам Індыі Пранабам Мукерджы. «Мы ніколі не хавалі гонару за адносіны з Індыяй, — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Мы гатовы прайсці свой шлях хутка, эфектыўна, адказна, калі будзе на тое ваша воля, вельмі хутка можам падняць і нашы гандлёва-эканамічныя адносіны на нармальны ўзровень, адпаведны нашым патэнцыялам».

Што тычыцца ўзаемадзеяння ў палітычнай сферы, дыпламатыі, то Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што ў Беларусі і Індыі ніколі не было дрэнных адносін і праблем. Аляксандр Лукашэнка запэўніў свайго індыйскага калегу, што так будзе і надалей.

«Спробы ізаляваць Беларусь, неяк паставіць на месца, націснуць — бесперспектыўныя, пакуль мы маем адносіны з такімі гіганцкімі дзяржавамі, як ваша», — сказаў беларускі лідар.

«Напярэдадні вашага візіту ў Беларусь з аднаго і другога боку, як мяне інфармавалі, яшчэ хапае скептыкаў у дачыненні да паглыблення нашага супрацоўніцтва. Напэўна, будзе правільна, калі мы падобных людзей моцна расчаруем і зробім максімум для таго, каб нашы адносіны былі маштабнымі», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

СТАР. 2

Фота БЕЛТА.



«УЛЁТНЫ» СЕНАКОС

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Леанід МАРЫНІЧ, першы намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання:

«Беларусь у студзені—красавіку 2015 года страціла на экспарце сельскагаспадарчай прадукцыі ў Расію прыкладна $180 млн. Сваю ролю ў гэтым адыгралі, у прыватнасці, нестабільнасць курса расійскага рубля, цэнавы фактар, а таксама зніжэнне аб'ёмаў. Усё гэта і вылілася нам у такую суму за чатыры месяцы. Цяпер сітуацыя пачынае стабілізавацца. Сёння выйшлі на той узровень, які дазваляе працаваць з пэўным прыбыткам. Мы клапоцімся пра сваю эканоміку. Таму пытанне не стаіць аб тым, каб прадаць любой цаной. Мы выходзім толькі з эканамічнай выгады кожнага прадпрыемства».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 04.06.2015 г.

Долар ЗША	14943,00	▲
Еўра	16657,00	▲
Рас. руб.	281,22	▲
Укр. грыўня	713,27	▲

ISSN 1990 - 763X

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

5 разоў на тыдзень!

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2015 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

УЗРОВЕНЬ, АДПАВЕДНЫ ПАТЭНЦЫЯЛУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прэзідэнты абмеркавалі канцэптуальна і практычна канкрэтныя сферы двухбаковага супрацоўніцтва і дамовіліся дыверсіфікаваць адносіны, паведамляе прэс-служба беларускага лідара. «Мы гатовы не толькі да абмеркавання, але і прыняцця канкрэтных рашэнняў», — адзначыў беларускі Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка прапанаваў Індыі рэалізацыю шэрагу новых сумесных узаемавыгадных праектаў з Беларуссю як у прамысловай, так і ў гуманітарнай сферах.

«З першых дзён незалежнасці Беларусі ваша краіна стала нашым верным і надзейным сябрам. За больш чым дваццацігадовую гісторыю дыпламатычных адносін мы наладзілі паўнавартасны партнёрскі дыялог. Сёння Беларусь гатова да яшчэ больш цеснага двухбаковага супрацоўніцтва», — падкрэсліў беларускі лідар.

«Маючы сучасныя тэхналогіі, абсталяванне, мы можам удзельнічаць у мадэрнізацыі горназдабываючай галіны Індыі, павышэнні прадуктыўнасці яе нафтагазавага сектара», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што ў найбліжэйшыя гады Індыя плануе значна павялічыць здабычу вугалю, што запатрабуе прыцягнення дадатковай тэхнікі для такой распрацоўкі. Паводле яго слоў, у Індыі ўжо працуюць велікагрузныя аўтамабілі БелАЗ і паказваюць высокія эксплуатацыйныя характарыстыкі. «Мы прапануем завяршыць да канца 2015 года стварэнне ў вашай краіне ўласнага цэнтра сэрвіснага абслугоўвання такіх складаных машын. Гэта дазволіць забяспечыць паўнавартасны ланцужок своечасовага, якаснага і эфектыўнага абслугоўвання беларускай кар'ернай тэхнікі ад яе продажу да эксплуатацыі», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандру Лукашэнку бачыцца перспектыўнай арганізацыя сумесных вытворчасцяў аўтобусаў, грузавых аўтамабіляў, камунальнай і дарожна-будаўнічай тэхнікі. «Упэўнены, што вырабленыя ў Індыі машыны і абсталяванне будуць карыстацца попытам і ў іншых краінах Паўднёва-Усходняй Азіі. Такім чынам, мы ў гэтыя краіны зможам выйсці ўжо з сумесной беларуска-індыйскай прадукцыяй», — падкрэсліў беларускі лідар. Пры гэтым, на яго думку, важна наладзіць не толькі абмен тэхналогіямі, але і ўзаемна развіваць тавараправодныя сеткі для выхаду на новыя рынкі.

Не менш перспектыўным, на думку кіраўніка беларускай дзяржавы, выглядае і ўзаемадзеянне ў галіне трактарабудавання. Беларускія трактары вядомы ў Індыі з савецкіх часоў. «Сёння, мабыць, эканамічна мэтазгодна прыступіць да арганізацыі ў Індыі сумеснай вытворчасці тэхнікі пад брэндам «Беларус». Гэты праект адпавядае духу праграмы «Рабі ў Індыі», якая рэалізуецца вашым урадам. З улікам індыйскай праграмы «Развіццё прафесійных навыкаў» мы маглі б аказаць дапамогу ў падрыхтоўцы спецыялістаў высокай кваліфікацыі, патрэбнай для вашай эканомікі», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі. Для гэтага ён прапанаваў абмеркаваць пытанне стварэння з беларускім удзелам тэхнічных навучальных цэнтраў у Індыі.

У пытанні сумеснага прасоўвання беларускіх і індыйскіх тавараў Аляксандр Лукашэнка лічыць важным таксама ўмацаванне сувязяў паміж банкамі і фінансавымі арганізацыямі дзвюх краін.

«Мы цесна ўзаемадзейнічаем з індыйскімі кампаніямі па рэканструкцыі і будаўніцтве аб'ектаў электраэнергетыкі Беларусі. Паглыбленне кааперацыі ў гэтай сферы, як і ў ажыццяўленні іншых інфраструктурных праектаў, будзе выгадна дзвюм краінам», — перакананы кіраўнік беларускай дзяржавы.

Беларускі бок вітае прыход індыйскіх інвестараў у сферу фармацэўтычнай вытворчасці, прымаючы пад увагу дасягненні Індыі ў фармацэўтыцы. На думку Аляксандра Лукашэнкі, перспектыўнымі могуць таксама стаць сумесныя распрацоўкі ў галіне нана- і біятэхналогій, мікраэлектронікі, машынабудавання, аднаўляльных крыніц энергіі.

«Такія вытворчасці мы прапануем стварыць у індустрыяльным парку «Вялікі камень». Рэзідэнты парка карыстаюцца падтрымкай урада Беларусі, беспрэцэдэнтнымі льготамі і бесперашкодным выхадам на рынак Еўразійскага эканамічнага саюза, а таксама Еўрапейскага саюза», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Прэзідэнт Беларусі выказаў упэўненасць, што сумесныя рашэнні паслужаць дадатковым імпульсам для рэалізацыі новых узаемавыгадных праектаў.

«З Індыяй нас раздзяляюць толькі геаграфічныя адлегласці, але яны ніколі не стануць перашкодай у развіцці кантактаў паміж нашымі краінамі і народамі, таму што ў нашых краін і народаў ёсць сур'ёзная гісторыя адносін», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Індыі Пранаб Мукерджы пацвердзіў вялікія перспектывы эканамічнага супрацоўніцтва з Беларуссю. На яго думку, гэтаму будзе садзейнічаць маючы адбыцца беларуска-індыйскі бізнес-форум. «Упэўнены, што беларускія і індыйскія кампаніі знойдуць агульныя інтарэсы», — сказаў Пранаб Мукерджы.

Ён паведаміў, што ўрад Індыі прыняў рашэнне прызнаць Беларусь рынкавай эканомікай. На яго думку, гэта палепшыць гандлёва-эканамічныя адносіны ў шмат разоў у найбліжэйшыя гады.

Пранаб Мукерджы падкрэсліў, што Індыя мае намер выдзеліць для сваіх кампаній крэдытную лінію ў $100 млн для рэалізацыі сумесных з Беларуссю праектаў у тых галінах, якія будуць вызначаны ў ходзе беларуска-індыйскіх перамоў на найвышэйшым узроўні.

«Нягледзячы на тое, што гандлёва-эканамічныя адносіны развіваюцца, ёсць вялікія магчымасці для іх актывізацыі, — лічыць індыйскі лідар. — Неабходна дыверсіфікаваць сектар прадаваных тавараў, каб перавысіць сённяшні ўзровень тавараабароту ў $400 млн».

Па выніках перагавораў на самым высокім узроўні быў падпісаны шэраг двухбаковых дакументаў. У прыватнасці Беларусь і Індыя падпісалі дарожную карту двухбаковага супрацоўніцтва, а таксама пратакол да міжурадавага пагаднення аб пазбяганні двайнога падаткаабкладання і папярэджанні ўхілення ад выплаты падаткаў у дачыненні да падаткаў на даходы і маёмасць (капітал). Мемарандумы аб супрацоўніцтве падпісаны ў сферы фінансаў, стандартызацыі і інфармацыйнай падтрымкі, у вяшчанні, у галіне тэкстылю, адзення і індустрыі моды.

■ Тры пытанні да ўлады

ІНВЕСТЫЦЫЙНЫ КЛІМАТ — СПРЫЯЛЬНЫ

Кіраўніцтва Гродзенскага аблвыканкама мае намер не проста палепшыць інвестыцыйны клімат рэгіёна, а зрабіць яго самым спрыяльным у краіне. Тры пытанні «Звязды» — да старшыні абласнога камітэта эканомікі Андрэя СВІРЫДАВА.

— Усе рэгіёны знаходзяцца ў аднолькавых эканамічных і заканадаўчых умовах. На чым жа грунтуецца ўпэўненасць, што ўмовы для бізнесу, інвестыцый на Гродзеншчыне рэальна зрабіць найлепшымі ў краіне?

— Па-першае, Гродзенская вобласць знаходзіцца, так бы мовіць, на стыку Еўрапейскага і Еўразійскага саюзаў. Натуральна, у нас ёсць умовы, каб развіваць паспяховы бізнес і з асноўным гандлёвым партнёрам — Расіяй, і з нашымі суседзямі з Літвы і Польшчы. Гэта цяпер, пэўна, галоўнае. Другое — гэта чалавечы патэнцыял у сэнсе сучасных падыходаў да развіцця сельскай гаспадаркі і іншых галін эканомікі, нашых універсітэтаў, прафесійнай адукацыі. І трэці фактар інвестыцыйнай прывабнасці Гродзеншчыны звязаны з рэалізацыяй праекта будаўніцтва Беларускай АЭС, які дае «штуршок» эканамічнаму развіццю вобласці.

— Якія праекты могуць служыць прыкладам эфектыўнага інвеставання ў эканоміку вобласці?

— Назаву тры буйныя праекты з удзелам замежных інвестыцый, якія паспяхова рэалізуюцца, ствараючы новыя тэхналогіі і рабочыя месцы. У Смаргоні аўстрыйская кампанія «Кронаспан» уклала каля 500 мільёнаў долараў у стварэнне дрэваапрацоўчай вытворчасці і працягвае паспяхова развівацца. Літоўская кампанія Arvi, заключыўшы вялікі інвестыцыйны дагавор, пабудавала на Лідчыне сучасны завод па перапрацоўцы і ўтылізацыі адходаў жывёльнага паходжання, актыўна ўзводзіць комплекс па вытворчасці мяса індычкі.

Трэба заўсёды глядзець аб'ектыўна, уваходзіць у кожную канкрэтную сітуацыю, умець вылучаць прыстойных партнёраў.

Наш прыярытэт — выкарыстанне турыстычнага патэнцыялу Гродзеншчыны і, у прыватнасці, беларускай часткі Аўгустоўскага канала. Некалькі інфраструктурных праектаў там цяпер рэалізуюцца. Пытанні супрацоўніцтва ў гэтай сферы старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Краўцоў нядаўна абмеркаваў з маршалкам

Падляскага ваяводства Мечыславам Башко. Кіраўнікі органаў улады суседніх рэгіёнаў лічаць, напрыклад, мэтазгодным змяніць статус пункта пропуску «Рудаўка-Лясная» на беларуска-польскай мяжы, каб ён выкарыстоўваўся не толькі для воднага, але і пешаходнага, веласіпеднага турызму.

Дарэчы, інвестыцыі ў розныя сферы (адукацыя, ахова здароўя, культура, турызм, жыллёва-камунальная гаспадарка, дарожнае будаўніцтва) у рамках апошніх праграм Еўрапейскага саюза па трансгранічным супрацоўніцтве склалі на Гродзеншчыне каля 19,1 мільёна долараў. Завершаны 32 праекты, і яшчэ 14 цяпер у рабоце.

— Некаторыя інвестыцыйныя праекты існуюць хіба што на паперы альбо становяцца даўгабудам. Што робіцца, каб змяніць гэтую сітуацыю?

— Мяркую, нават на дэкларацыі аб намерах нельга закрываць вочы. У першую чаргу важны падыход да інвестараў. Трэба заўсёды глядзець аб'ектыўна, уваходзіць у кожную канкрэтную сітуацыю, умець вылучаць прыстойных партнёраў, якім трэба ўсяляк дапамагаць, і тых, хто хоча толькі нешта «наварыць» на куплі-продажы. Апошнім часам маем справу ў асноўным менавіта з добрасумленнымі інвестарамі.

Барыс ПРАКОПЧЫК

■

ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ

І «АД ЛАПЦЯЎ — ДА АБЦАСІКАЎ»...

У гонар святкавання 950-й гадавіны Браслава пройдзе міжнароднае свята традыцыйнай культуры «Браслаўскія зарніцы-2015».

— 6 чэрвеня адбудзецца ўрачыстае адкрыццё. У праграме: абласны агляд-конкурс вакальна-харавых калектываў «Браслаўскія харавыя асамблеі», конкурс бытавых беларускіх танцаў. Традыцыйна шмат гледачоў прыходзяць на свята сяброўскай культуры «Меч Брачыслава». На ім можна азнаёміцца з бытам воінаў, убачыць гістарычныя рэканструкцыі. Вельмі цікавым будзе шоу агню, іншыя акцыі, мерапрыемствы, — паведамілі «Звяздзе» ў райвыканкаме. На наступны дзень у райцэнтры адбудуцца: тэатралізаванае прадстаўленне «Гісторыя Браслаўшчыны ў пакаленнях», урачыстае шэсце ўдзельнікаў свята, гала-канцэрт з удзелам творчых калектываў Віцебскай вобласці, а таксама зАзербайджана, Індыі, Латвіі, Польшчы, Расіі, Эстоніі. Будзе арганізавана выстава-продаж ад прадпрыемстваў Браслаўскага раёна, запрацуюць рамесныя рады…

Абяцае быць цікавым конкурс-забег «Ад лапцяў — да абцасікаў». Гараджан і гасцей чакаюць і атракцыёны, гульнявыя пляцоўкі. Усе ахвотныя змогуць наведаць выставу прадметаў побыту Браслаўшчыны пачатку XX стагоддзя «Правінцыйны побыт», а таксама «Была вайна ў родным краі», прысвечаную юбілею Вялікай Перамогі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

У ГОНАР ВЫПУСКНІКА-ГЕРОЯ

У баранавіцкім ліцэі №1 урачыста адкрылі мемарыяльную дошку ў памяць пра выпускніка. Капітан памежных войск Андрэй Навіцкі загінуў у 2013 годзе пры выкананні службовых абавязкаў па абароне дзяржаўнай мяжы. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь капітан Навіцкі ўзнагароджаны ордэнам «За службу Радзіме» III ступені.

У роднай школе Андрэя сабраліся яго родныя і блізкія, таварышы па службе з Гродна, настаўнікі і вучні. Пра Андрэя Іосіфавіча сказалі шмат цёплых слоў тыя, хто ведаў спачатку вучня, потым курсанта і, нарэшце, афіцэра Навіцкага.

Цяпер ён назаўсёды застаецца ў сваёй школе, каб напамінаць сённяшнім вучням аб смеласці, гераізме, адданасці Радзіме.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

НА КАНЦЭРТ І НАЗАД — ЗА АДЗІН ДЗЕНЬ

Беларуская чыгунка на час правядзення фестывалю «Славянскі базар у Віцебску» прызначыла цягнік міжрэгіянальных ліній №644/643, які будзе курсіраваць паміж Мінскам і абласным цэнтрам.

Гэты цягнік будзе абслугоўваць пасажыраў штодня з 7 па 15 ліпеня. У першы рэйс ён адправіцца 7 ліпеня напярэдадні святочных мерапрыемстваў. Цягнік міжрэгіянальных ліній будзе адыходзіць ад станцыі Мінск-Пасажырскі ў 12.48 і прыбываць у Віцебск у 16.25, пра што распавялі ў прэс-цэнтры магістралі. Беларуская чыгунка таксама прадугледзела зручны графік руху ў зваротным кірунку. Паглядзеўшы канцэрт, госці «Славянскага базару» на гэтым жа цягніку змогуць выехаць з Віцебска ў 1.40 і быць у сталіцы ранкам у 5.28.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне члену Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па аховe здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Лісковічу Віктару Андрэевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.

УНП 101244817

Учреждение образования
«Частный институт управления и предпринимательства»
с 1 августа по 30 сентября 2015 г.

ОБЪЯВЛЯЕТ НАБОР В АСПИРАНТУРУ

по специальности 08.00.05 – «Экономика и управление народным хозяйством (по отраслям и сферам деятельности: экономика, организация и управление предприятиями, отраслями, комплексами; экономика предпринимательства)».
Обучение платное.

Полную информацию можно получить по адресу:
220086, г. Минск, ул. Славинского, 1, корп. 3, аспирантура.
Тел.: 263 38 26, +375 44 562 72 10, сайт: www.imb.by.

К сведению акционеров
ОАО «Современные розничные технологии»

16 июня 2015 года в 12.00
по адресу: г. Минск, ул. Берестянская, 17, 13 этаж состоится внеочередное общее собрание акционеров
ОАО «Современные розничные технологии».

Форма проведения собрания – очная.
Регистрация участников: с 11.30 до 11.55.
Для регистрации на собрании акционеру необходимо при себе иметь паспорт (для представителя акционера – паспорт и доверенность).

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О заключении крупной сделки с заинтересованностью аффилированных лиц Общества.

Орган, созывающий собрание акционеров: Наблюдательный совет ОАО «Современные розничные технологии», основание созыва: решение от 28.05.2015 (протокол № 7).

С материалами, подготовленными к собранию, акционеры могут ознакомиться с 08.06.2015 по адресу: г.Минск, ул. Берестянская, 17, 13 этаж по рабочим дням с 14.00 до 16.00, а также в день проведения общего собрания акционеров по месту проведения собрания с 11.30 до 11.55.

УНП 690019195

■ Падрабязнасці

Рух цягнікоў адноўлены

На ўчастку Калінкавічы — Жлобін ужо ранкам учарашняга дня праследаваў пасажырскі цягнік №670 Гомель — Жлобін.

Нагадаем, што напярэдадні ў Светлагорскім раёне сышлі з рэек 12 вагонаў са шчэбнем. Здарэнне адбылося а палове восьмай ранку на ўездзе на чыгуначную станцыю Светлагорск з боку станцыі Калінкавічы. Пры прыбыцці таварнага саставу, які ішоў у Жлобін, на з'ездзе з асноўных пуцей адбыўся сыход з рэек 12 вагонаў (11 паўвагонаў са шчэбнем і адной платформы). Усяго састаў складаўся з 70 вагонаў. У выніку было пашкоджана каля 110 метраў асноўных пуцей. Пацярпелых не было. Для перавозкі пасажыраў арганізоўваліся дадатковыя аўтобусныя маршруты. На ліквідацыю аварыі былі накіраваны аднаўленчыя цягнікі са станцый Калінкавічы, Жлобін, Гомель. На Беларускай чыгунцы створана камісія, прычыны здарэння ўстанаўліваюцца.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

■ Каб было цёпла

ПАТРАБУЙЦЕ ЛІЧЫЛЬНІК!

Вы не павінны аплачваць энергетычныя страты — толькі фактычна атрыманае цяпло

Гэта падчас «прамой лініі» ў нашай газеце растлумачыў намеснік старшыні Дзяржстандарта — дырэктар дэпартамента па энергаэфектыўнасці Сяргей СЯМАШКА.

Адказваючы на пытанне чытача аб адсутнасці ў яго доме лічыльніка і залішняй плаце за цяпло, спецыяліст параіў патрабаваць устаноўку лічыльніка: «Урад прыняў рашэнне, што ўсе шматпавярховыя шматкватэрныя (болей за 20 кватэр) дамы павінны быць абсталявы лічыльнікамі цяпла. У свой час усе далі справаздачу, што гэтыя прылады ўсталяваны. Летась мы правялі кампанію па праверцы жылых дамоў. Лічыльнікі альбо не ўсталяваны, альбо не працуюць, альбо састарэлі. Асабліва гэта характэрна для раённых цэнтраў. Зусім нядаўна прынята пастанова Савета Міністраў (ад 26 мая 2015 года №443 «Аб падрыхтоўцы да працы ў асенне-зімовы перыяд 2015-2016 гг.»), у якой абавязалі ўсе аблвыканкамы забяспечыць спраўнасць працы гэтых лічыльнікаў. Таму неабходна патрабаваць. Калі ёсць лічыльнік на дом, то людзьмі будзе аплачана ўсё цяпло, якое туды прыйшло. Страты падчас транспарціроўкі для жыхароў дома не будуць мець ніякага значэння».

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Адказы на астатнія пытанні чытайце ў адным з найбліжэйшых нумароў «Звязды».

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ, Сяргей КУРКАЧ

■

70 1945 2015 гадоў Вялікай Перамогі

МЕДАЛЬЁНЫ ВЯРТАЮЦЬ ІМЁНЫ

Магілёўскія школьнікі вывучаюць гісторыю Вялікай Айчыннай не толькі па падручніках

«Яны маюць права на ўсё. Акрамя забыцця. Нават калі іх імёны невядомы і па-ранейшаму значацца ў спісах зніклых без вестак». Гэтыя словы сталі лейтматывам выставы «Загінулым вяртаюць імёны прачытаныя намі медальёны». Яна своеасаблівая справаздача таго, што зроблена пошукавікамі абласнога гістарычна-патрыятычнага клуба «Вікру».

Сёння ён аб'ядноўвае 23 атрады і групы, якія дзейнічаюць на базе 16 устаноў адукацыі вобласці. Штогод навучэнцы разам са сваімі кіраўнікамі здзяйсняюць краязнаўчыя пошукавыя экспедыцыі па месцах былых баёў. З іх дапамогай выяўлены дзясяткі невядомых раней пахаванняў, урачыста перапахаваны 400 байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі, імёны 38 з іх устаноўлены, наладжана сувязь з роднымі герояў.

Сярод экспанатаў — прадметы ваенных часоў, часопісы, кнігі, шматлікія фотаздымкі і дзясяткі газетных публікацый пра пошукавую дзейнасць клуба. Газетны шэраг пачынаецца менавіта са «Звязды» — яна неаднойчы пісала пра тую важную працу, якая робіцца пошукавікамі. **Кіраўнік «Вікру» пісьменнік Мікалай БАРЫСЕНКА** дэманструе патрон. Незвычайнае ў ім тое, што ён... пастрэлены. Зусім «свежы» экспанат, з яго нават яшчэ зямля сыплецца. 70 гадоў ён праляжаў у зямлі каля Буйніч — таго самага легендарнага поля мужнасці, апетага Канстанцінам Сіманавым у рамане «Жывыя і мёртвыя».

— На 30% усё, што мы прадставілі, абноўленае, з'явіліся новыя фотаздымкі, кнігі. Нарэшце перамагла гістарычная справядлівасць — выдадзена кніга пра «забытую» 161-ю Магілёўскую гвардзейскую дывізію. Палова яе — архіўныя дакументы, рэдкія здымкі, — расказвае Мікалай Барысенка.

Юнакі разглядаюць схаваныя за шклом «жалезкі». Ёсць тут вельмі рэдкія раменныя спражкі, якія ў «чорных капальнікаў» на вагу золата. Напрыклад, юнацкай фашысцкай арганізацыі «Дойчэ юнгфольк». Побач не менш эксклюзіўная — штурмавіка СА. Яны таксама знойдзены пад Магілёвам. Яшчэ ў адной вітрыне кажух са ствалом кулямёта МГ — знаходка з месца абарончых баёў у раёне вёскі Брускі, дзе 172-я дывізія выходзіла з акружэння. Рэшткі самалётаў — адзін выцягнуты з дрыгвы ў Клічаўскім раёне, другі знойдзены каля вёскі Макаранцы. Па нумары рухавіка быў устаноўлены экіпаж бамбардзіроўшчыка.

Каб адразу паказаць усё тое, што было знойдзена пошукавікамі больш чым за 20 гадоў існавання клуба, спатрэбілася б не адна такая зала. І гэта не ўлічваючы тыя экспанаты, якія захоўваюцца ў школьных музеях баявой славы. У красавіку быў аб'яўлены абласны конкурс «Іх подзвіг мы ў сэрцы захаваем», каб выявіць, наколькі адчувальнай можа быць іх роля ў выхаванні моладзі. Уразіцца было чаму. Музеямі сабраны запісы ўспамінаў удзельнікаў вайны, створаны аўдыя- і відэатэкі «Жывыя галасы ветэранаў», фонды папоўніліся экспанатамі перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

За апошнія тры гады пошукавым атрадам «Узлёт», што існуе пры музеі Дараганаўскага вучэбна-педагагічнага комплексу дзіцячы сад-сярэдняя школа, выяўлены 12 няўлічаных месцаў пахаванняў чырвонаармейцаў і партызан, праведзена перапахаванне астанкаў у брацкую магілу каля школы, устаноўлены відавочца трагедыі масавага расстрэлу дзяцей з санаторыя «Крынкі». Фонды музея папоўніліся на 373 адзінкі, сярод экспанатаў — рама кабіны «юнкерса», збітага ў 1944 годзе над тэрыторыяй Дараганаўскага сельсавета, каркас кавалерыйскага сядла, кавалерыйская шашка і шмат чаго іншага.

Працоўнай групай «Інфанет» Магілёўскай сярэдняй школы №34 створаны электронны архіў фондаў музея, аблічбаваны тысячы тэкставых старонак і ўсё гэта выкладзена на сайт установы. За апошнія два гады гэтую каштоўную інфармацыю прагледзелі больш за 120 тысяч наведвальнікаў з розных краін свету. У школьным музеі захоўваецца відэаархіў успамінаў ветэранаў і відэатэка фільмаў па гісторыі Магілёва, а дзякуючы ўнікальнай картатэцы помнікаў, пахаванняў, мемарыяльных і памятных дошак на тэрыторыі Магілёва, звязаных з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны, нават завязалася супрацоўніцтва з Нацыянальнай службай узаемнага пошуку людзей «Чакай мяне». І гэтыя школы не выключэнні. Самае каштоўнае тое, што ўвесь гэты бясцэнны матэрыял не ляжыць у іх музеях мёртвым грузам — тут ладзяцца тэматычныя заняткі, экскурсіі, сустрэчы з ветэранамі. Праводзяцца выязныя ўрокі, арганізуюцца перасовачныя экспазіцыі, каштоўная інфармацыя выкладваецца ў інтэрнэт.

Цікавыя экспанаты.

Фашысты пакінулі на захопленай зямлі не толькі свае жыцці, але і «жалезкі»...

Па выніках абласнога конкурсу музеяў найлепшым школьным музеем названы Дараганаўскі (Асіповіцкага раёна), якім кіруе Жанна Караленя. У якасці каштоўных прызоў ён атрымаў ноўтбук і энцыклапедыі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

АДПАЧЫНАК З СЭНСАМ

Навесці за лета парадак на тэрыторыі пяці праваслаўных храмаў — такое рашэнне прынялі сумесна Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і Гомельская епархія.

Рэалізацыю рэспубліканскага праекта «Аднаўленне святынь Беларусі» моладзь добраахвотнага руху «Добрае сэрца» на тэрыторыі Гомельшчыны пачала з тэрыторыі Свята-Петра-Паўлаўскага сабора. Там маладыя людзі дапамаглі разбіць кветнікі. Наступным стаў падворак Свята-Мікольскага мужчынскага манастыра.

Студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту і Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф.Скарыны на даволі вялікай тэрыторыі манастырскага падворка, якая ў савецкія часы была піянерлагерам, прыбіралі смецце, рамантавалі гаспадарчыя пабудовы і нават секлі дровы. **Удзельнік дабрачыннай акцыі Настасся ЛАШКЕВІЧ** пераканалася, што на вялікай тэрыторыі работы хопіць усім:

— Людзей не хапае для таго, каб давесці да ладу тэрыторыю гэтага падворка. Таму студэнты зрабілі добрую справу.

Святары загадзя падрыхтавалі спіс храмаў, якія маюць асаблівую патрэбу ў дадатковых рабочых руках. Напярадзе — добраўпарадкаванне тэрыторый храмаў Серафіма Сароўскага, Праабражэння Гасподняга ў Гомелі, а таксама храма ў гонар свяціцеля Мікалая Цудатворца ў вёсцы Данілавічы. Валанцёры ездзяць па рэгіёне групамі — прыкладна па дваццаць чалавек. Адначасова святары епархіі праводзяць экскурсіі — расказваюць пра гісторыю храмаў, якія добраўпарадкоўваюцца. **Кіраўнік аддзела па рабоце з моладдзю Гомельскай епархіі іерэй Сергій КЛІМАЎ** лічыць, што калі чалавек штосьці робіць, ён павінен разумець галоўную мэту сваёй справы.

— Калі ён гэтага не разумее, любая праца становіцца бессэнсоўнай. Хацелася б, каб такім чынам атрымаліся і жывыя стасункі актывістаў добраахвотнага руху і праваслаўнай моладзі з брацтваў і праваслаўных маладзёжных груп.

Далучыцца да акцыі могуць усе зацікаўленыя. Аднаўленчыя работы плануецца закончыць да жніўня.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Каб пракат цябе не «пракаціў»...

Міністэрства гандлю ў рамках ажыццяўлення кантролю за захаваннем заканадаўства ў сферы бытавога абслугоўвання правяло маніторынг аб'ектаў пракату аўтамабіляў і веласіпедаў ва ўсіх рэгіёнах краіны.

Па іх выніках парушэнні нормаў Правілаў бытавога абслугоўвання спажыўцоў выяўлены ў 15 праверэных аб'ектах з 21 (71,4 працэнта). Сярод тых, што найбольш часта сустракаюцца, — адсутнасць інфармацыйнага стэнда для спажыўцоў, парушэнні ў частцы афармлення і размяшчэння неабходных дакументаў і іншай інфармацыі на такіх стэндах, адсутнасць у работнікаў, якія непасрэдна абслугоўваюць спажыўцоў, нагрудных значкоў, неадпаведнасць фактычнага рэжыму працы ўзгодненаму з мясцовымі выканкамамі. У трох праверэных аб'ектах пракату (у Мінску і Магілёве) устаноўлены факты аплаты спажыўцамі прадастаўленых паслуг замежнай валютай.

Арганізацыям пракату, якія дапусцілі парушэнні, дадзены рэкамендацыі па выпраўленні выяўленых недахопаў, а таксама ўказана на няўхільнае захаванне нормаў заканадаўства ў сферы бытавога абслугоўвання.

Сяргей РАСОЛЬКА.

АЛЬТЭРНАТЫЎНАЯ ДЫПЛАМАТЫЯ МІХАІЛА МАРГУЛІСА

Агульныя каштоўнасці як спосаб знайсці паразуменне

Канфлікты паміж краінамі і ўнутры краін могуць вырашыцца, калі бакі знойдуць у сябе агульныя каштоўнасці. Менавіта на гэтым базіруецца канцэпцыя альтэрнатыўнай дыпламатыі Міхаіла МАРГУЛІСА, прэзідэнта рэлігійных арганізацый «Духоўная дыпламатыя» і «Хрысціянскі мост», ганаровага консула нашай краіны ў штаце Фларыда.

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Міхаіл МАРГУЛІС *(злева)* з Аляксандрам ВАЛКОВІЧАМ — даўнія сябры.

Падчас апошняга прыезду ў Беларусь Міхаіл Маргуліс сустрэўся з **Аляксандрам ВАЛКОВІЧАМ, пісьменнікам, рэдактарам брэсцкага раённага краязнаўчага альманаха «Астрамечаўскі рукапіс».** З ім яны даўнія сябры. Пазнаёміліся ў 2004 годзе, калі Міхаіл Маргуліс прыехаў у Брэст, суправаджаючы на гістарычную радзіму ўраджэнца Століншчыны — місіянера Алекса Леановіча. Тады Аляксандр Валковіч запрасіў Міхаіла Маргуліса на інтэрв'ю, падчас размовы выспела ідэя напісання сумеснай кнігі аб развіцці Беларусі, хрысціянскіх каштоўнасцях, маралі з пункту гледжання прапаведніка і атэіста. Праца над кнігай працягваецца і зараз.

Разам з Аляксандрам Валковічам на сустрэчу з амерыканскім госцем накіраваліся і карэспандэнты «Звязды». Міхаіл Маргуліс пагадзіўся расказаць нашым чытачам пра сваю тэорыю мірнага суіснавання краін, украінскі канфлікт, сутнасць хрысціянства, асабістае стаўленне да Беларусі і беларусаў.

— Міхаіл Зіноўевіч, як вы прыйшлі да канцэпцыі духоўнай дыпламатыі?

— У 1991 годзе арганізаваў першы афіцыйны візіт лідараў амерыканскіх хрысціян у Савецкі Саюз. Мы пабывалі ў Вярхоўным Савеце, КДБ, Акадэміі навук, Савеце Міністраў. У Крамлі нас прыняў Міхаіл Гарбачоў, Прэзідэнт Савецкага Саюза. Тады я расказаў яму пра сваю ідэю: рашаць унутраныя і знешнія канфлікты не традыцыйнымі метадамі, а з дапамогай духоўных каштоўнасцяў канфліктуючых бакоў. Напрыклад, мусульманін і хрысціянін павінны знайсці ў Бібліі і Каране ідэнтычныя месцы, якія гавораць пра мір, любоў, узаемапаразуменне паміж людзьмі. А Гарбачоў у адказ сказаў: «Для мяне гэта гучыць утапічна, але, думаю, у будучыні гэта будзе дзейнічаць». Так яно і атрымалася. Мы былі ў 56 краінах. У многіх месцах мелі магчымасць спыніць канфлікт — гэта было ў В'етнаме, часткова ў Ізраілі, часткова ў Камбоджы. Мы стараемся прыкладаць намаганні, каб вызваліць некаторых людзей з турмаў, імкнёмся растлумачыць значэнне хрысціянства.

Большасць хрысціян у свеце жыве ад наведвання да наведвання царквы. Амерыканскае хрысціянства — натуральна, не ўсё, але ў многім — іншае. У Амерыцы хрысціяне — не толькі рэлігійная група. Іх у нас больш за 180 мільёнаў. Гэта палітыкі, бізнесмены, эканамісты, навукоўцы... Мы заўсёды гаворым, што хрысціянства — гэта не рэлігійны фанатызм, гэта шырокае жыццё. Можна выказацца партыйным словам — ідэалогія, хоць гэта і не ў поўным сэнсе яна.

Мне Прэзідэнт вашай краіны некалі сказаў: «Майкл, я разумею, гэта ўсё добра, але вы ж ведаеце, як часта ў свеце людзі выкарыстоўвалі рэлігію для прыкрыцця палітычных канфліктаў». Так, і зараз выкарыстоўваюць. Але я маю на ўвазе не ўсю рэлігію, а толькі тое, што рэальна мае месца быць. Я не кажу пра некаторыя накірункі ісламу, які зараз заняў агрэсіўную пазіцыю, не кажу пра намінальнае хрысціянства, я кажу пра амерыканскае пратэстанцка-евангельскае хрысціянства. Думаю, што наш духоўны рух атрымаў увасабленне ў жыцці і шмат разоў спыняў канфлікты.

— Вы наведалі больш чым паўсотні краін, прапаведавалі хрысціянства, расказвалі пра сваю канцэпцыю духоўнай дыпламатыі. Наколькі ўспрымаюць яе звычайныя людзі, ідэя гэтая ўсё ж такі некалькі нерэальнае...

— Калі Жуль Верн пісаў пра жалезных птушак і падводныя лодкі, усе называлі гэта фантазіяй. Але сёння лятаюць самалёты, лодкі пагружаюцца на дно акіяна. Усё можа стаць рэальнасцю. Наша канцэпцыя ўжо не цалкам утапічная, бо сёння дыпламатам ужо не вераць. А мы ніколі нічога не просім, нічога нам не патрэбна. Палітыкі разумеюць гэта і давяраюць нам.

— Не магу не ўзгадаць пра Украіну. Вы былі на Майдане. Якія намаганні вы прыкладалі, каб спыніць гэты канфлікт?

— Часам у мяне бывае інтуіцыя на нейкія трывожныя падзеі ў свеце. Я адчуваў, што нешта такое адбудзецца ва Украіне і папярэджваў амерыканцаў: «Не будзіце людзей, дачакайцеся выбараў, праз год Януковіча не скочуць...» Але яны падахвочвалі маладых людзей, плацілі нейкія грошы. Вынікам усяго гэтага стаў бунт.

«Мы былі ў 56 краінах. У многіх месцах мелі магчымасць спыніць канфлікт — гэта было ў В'етнаме, часткова ў Ізраілі, часткова ў Камбоджы».

Я сустрэўся два разы з Януковічам, адзін раз я шчыра яму сказаў: «Віктар Фёдаравіч, у мяне такое адчуванне, што выспявае бунт і будзе кроў». А ён мне: «Вы ў Амерыцы, далёка, а Украіна мяне любіць». Яго памочнікі прыдумалі яму такую краіну, якой не было ў рэальнасці.

Калі ж пачаўся Майдан, я і амерыканцаў прасіў, і з паслом амерыканскім у Кіеве размаўляў: не трэба заводзіць людзей, моладзь настроена нацыяналістычна і будзе дабівацца свайго, а не слухаць вас. Некаторыя мяне слухалі, але змяніць ход гісторыі было ўжо немагчыма.

Я сапраўды быў на Майдане, калі хрысціяне кідалі бутэлькі з запальнай сумессю і казалі блюзнерскія рэчы: маўляў, калі б Хрыстос быў тут, ён бы таксама кідаў бутэлькі. Грэх такое казаць. Гэта быў бунт, звяржэнне законна выбранага прэзідэнта. Сапраўды, былі падставы яго зняць, але не такімі метадамі.

— Вы кансультуеце амерыканскі ўрад, Кангрэс, асноўваючыся на прынцыпах духоўнай дыпламатыі. Наколькі яны адкрыты для гэтага? Ці прыслухоўваюцца да вашых парад? Бо ўсё ж такі Амерыка — краіна, якая ва ўсім свеце зарэкамендавала сябе як агрэсіўная дзяржава...

— Амерыку мала хто ведае, асабліва тут. Амерыка — гэта глыбока хрысціянская краіна і... вясковая: вельмі шмат фермерскіх гаспадарак у нас. Пра яе многія думаюць, што гэта, у першую чаргу, Уол-стрыт, віскі і Абама. Гэта няправільна. У Амерыцы людзі імкнуцца прытрымлівацца хрысціянскіх каштоўнасцяў, дапамагаць адзін аднаму, дапамагаюць замежнікам, людзям, якія толькі пачынаюць жыць у гэтай краіне. У Амерыцы прадугледжана вельмі добрая сацыяльная дапамога людзям бедным, хворым...

Наконт вашага пытання. Сапраўды, да мяне сталі прыслухоўвацца. Апошнія 11 гадоў мы імкнёмся пераканаць амерыканскі Кангрэс, урад зробіць крокі насустрач Беларусі. І дагэтуль ёсць санкцыі ў адносінах да вашых прадпрыемстваў, у той час калі ваша краіна мае патрэбу ў амерыканскім рынку. Праўда, некаторыя абмежаванні ўжо зняліся: у адносінах да «Беларуснафты», аднаго вашага банка; зараз плануецца зняцце іншых санкцый, пашырэнне пасольстваў дзвюх краін. Гэта знак таго, што прыслухоўваюцца.

— Міхаіл Зіноўевіч, вы нарадзіліся ва Украіне, з любоўю гаворыце пра Амерыку і абараняеце інтарэсы Беларусі. Усё ж такі, прадстаўніком якога народа вы сябе лічыце?

— Мяне пытаюць: чаму Беларусь? Мяне вельмі многаму навучыў мой духоўны бацька — Аляксей Паўлавіч Леановіч, які меў беларускае паходжанне. І неяк паступова я пранікся любоўю да Беларусі: яна такая невялікая, сціплая. Ёсць нябачныя духоўныя ніці... Шмат людзей я тут палюбіў — мне падабаецца іх душэўнасць, раздумлівасць, падабаецца іх пакорлівасць. У мяне шмат сяброў тут: пісьменнік Аляксандр Міхайлавіч Валковіч, кампазітар Ігар Лучанок, трошкі ведаў Васіля Быкава, Уладзіміра Мулявіна. Увогуле, любоў жа не растлумачыш...

вілі іх амерыканскім бізнесменам. Сённяшнія кліенты Парка высокіх тэхналогій — гэта і Microsoft, і Coca-Cola, і American Airlines... Таксама мы арганізоўвалі сустрэчу ў горадзе Сарасоце Алега Краўчанкі, кіраўніка ўпраўлення Амерыкі пры МЗС Беларусі, з амерыканскімі бізнесменамі. Мы імкнёмся прыцягнуць увагу да Беларусі амерыканскіх кампаній, банкаў, каб яны ўваходзілі ў яе эканамічную сістэму.

— У чым мэта вашай цяперашняй паездкі ў Беларусь? Учора вы разам з камандай амерыканскіх баскетбалістаў пабывалі ў дзіцячым доме для дзяцей-інвалідаў і маладых інвалідаў у Чэрвені...

— Мы і іншыя беларускія дзіцячыя дамы наведалі. Былі ў Гомелі, у доме для дзяцей, якія нарадзіліся з анкалагічнымі захворваннямі, былі ў Вілейцы, былі ў Чэрвені, дзе 70 дзяцей з 293 — нерухомыя. Дарэчы, з намі там быў дастаткова вядомы амерыканскі кангрэсмен Стывен Пірс, якога я ўгаварыў паехаць з намі ў Беларусь.

Увогуле, гэтая паездка — яшчэ адзін крок на шляху да паляпшэння адносін паміж Амерыкай і Беларуссю. Не толькі палітыкі павінны прасоўваць узаемаадносіны паміж краінамі, але і мы самі.

ДАВЕДКА

Багаслоў, прапаведнік, пісьменнік, доктар літаратуры Міхаіл (Майкл) Маргуліс нарадзіўся ў Кіеве, аднак у 70-х гадах эмігрыраваў у Злучаныя Штаты, дзе прыняў пратэстантызм. З'яўляецца аўтарам новай духоўна-палітычнай канцэпцыі «духоўная дыпламатыя». У яе аснове — пераадоленне канфліктаў унутры краін і паміж краінамі з дапамогай духоўных каштоўнасцяў канфліктуючых бакоў. Шмат гадоў Міхаіл Маргуліс працаваў пазаштатным экспертам па Усходняй Еўропе з амерыканскімі сенатарамі Джэсі Холмсам і Маркам Хэтфілдам. Вядомы яго палітычныя артыкулы «Амерыцы патрэбны новыя сябры», «Дэградацыя амерыканскай дыпламатычнай школы», «Таталітарызм лібералізму», «Як разумець свабоду».

Сустракаўся з 5 прэзідэнтамі ЗША: Джымі Картэрам, Рональдам Рэйганам, Джорджам Бушам, Білам Клінтанам і Баракам Абамам. А таксама з прэзідэнтам СССР Міхаілам Гарбачовым, прэзідэнтам Украіны Віктарам Януковічам, прэзідэнтам Кыргызстана Аскарам Акаевым... Міхаіл Маргуліс даволі часта прыязджае ў Беларусь і з асаблівай павагай ставіцца да шляху развіцця, які абрала наша краіна. Вядома выказванне гэтага чалавека пра беларусаў, якое гучыць так: «Вас жыццё навучыла цярпенню, а цярпенне навучыла вас жыць». Міхаіл Маргуліс неаднаразова сустракаўся з Прэзідэнтам нашай краіны Аляксандрам Лукашэнкам.

Як украінец, я свабодна размаўляю па-ўкраінску, скончыў Кіеўскі ўніверсітэт. Але не магу сказаць, што цалкам лічу сябе ўкраінцам. У нас у сям'і вельмі шмат розных нацыянальнасцяў: акрамя славянскіх, гэта італьянцы, амерыканцы, яўрэі, нават літоўцы ёсць. Я не лічу сябе прыналежным да нейкага аднаго народа, а адчуваю сваю прыналежнасць да ўсіх народаў, усіх людзей і не цікаўлюся, да якой нацыянальнасці яны сябе адносяць.

Вось ішоў я па Мінску, а насустрач мне ідзе бабулька з ландышамі. Я гляджу на яе, а яна мяне пытае: «Ты што, ведаеш мяне, сынок?» Адказваю: «Так, трошкі ведаю». Падышоў і абняў яе. Яна стала плакаць. Вось і ўся гісторыя пра маю любоў да вашай краіны. Тое ж самае я часам адчуваю ва Украіне, у Амерыцы.

— То бок у нейкім сэнсе вы — касмапаліт?

— Так, у добрым сэнсе, дэмакратычным. Касмапаліт — які належыць усім і жыве для ўсіх.

— З'яўляючыся ганаровым консулам Беларусі ў Фларыдзе, як вы прасоўваеце ідэю сяброўства паміж Амерыкай і Беларуссю? Вы паказалі нам праект беларуска-амерыканскага гандлёвага дома...

— Гэты праект пакуль што ў далёкай перспектыве. Што да сённяшняй працы, то мы цесна ўзаемадзейнічаем з Паркам высокіх тэхналогій — гэта гонар Беларусі, ён вядомы ва ўсім свеце. Нядаўна ў Маямі мы прадста-

Зараз век высокіх тэхналогій, людзі з дапамогай інтэрнэту сталі бліжэйшымі адзін да аднаго. Думаю, што наша паездка была вельмі важнай: гэта духоўная дыпламатыя праз спорт. У нас было дзве гульні: у Мінску і Магілёве. У Мінску мы прайгралі, у Магілёве выйгралі. У выніку перамагла дружба.

— Вы з'яўляецеся прафесарам літаратуры, пісьменнікам. А беларускія матывы адлюстроўваюцца ў вашай літаратурнай творчасці?

— Больш у журналісцкай. Пішу па выніках сваіх паездак у Беларусь — пра яе развіццё, дасягненні.

Калісьці ваш Прэзідэнт сказаў: «Спадар Маргуліс, мы выбралі наш шлях. Магчыма, ён не найлепшы, магчыма, на ім будзе шмат памылак, але гэта наш шлях. Мы не хочам быць прыдаткам ні да Расіі, ні да Амерыкі, ні да нейкай іншай краіны. Мы хочам быць самастойнымі і сябраваць з усімі». Сапраўды, няма раю на Зямлі, няма яго і ў Беларусі, няма яго і ў Амерыцы, хоць там і камфортна жыць. Але кожны з нас можа пабудаваць рай у сваім сэрцы. Я заўсёды кажу, што грошай і любові ніколі не бывае шмат. Грошай, каб усім дапамагчы, у нас не хопіць, але любоў сваю мы можам даць. І, на маю думку, гэта адна з самых вялікіх мэт. Калі я памру ў той момант, як буду дапамагаць некаму, я буду шчаслівы. Увогуле, кожны чалавек, нават калі ён дрэнны, стане трошкі лепшым, калі вы скажаце яму добрыя словы.

Надзея ЮШКЕВІЧ.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

4 ЧЭРВЕНЯ 2015 г.
ЧАЦВЕР
№ 11 (15770)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Валерыя ГРЫБУСАВА:

«Пераможца ніколі не здаецца»

У свае 20 гадоў артыстка ўжо мае багаты сцэнічны вопыт. За плячыма — конкурсныя спаборніцтвы ў Парыжы, Ялце, Санкт-Пецярбургу, Маскве. Сакрэт яе перамог часткова ў тым, што дзяўчына-максімалістка і разам з тым вельмі патрабавальная да сябе ў любой справе, за якую бярэцца. Сёлета Валерыя Грыбусава выбрана прадстаўляць Беларусь на XXIV міжнародным конкурсе выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2015». Мы сустрэліся з ёй, каб пагаварыць пра падрыхтоўку да конкурсу, веру ў сябе і імправізаваныя канцэрты на дачы...

— Літаральна праз месяц цябе чакае конкурс. На якой стадыі падрыхтоўка да «Славянскага базару»?

— Рэпеціруем з аркестрам славянскі хіт. Яшчэ наведваю заняткі па вакале і сцэнічным маўленні. Паколькі ў мяне тры розныя кампазіцыі, то будзем і розныя вобразы ствараць. Мая першая песня «Спі, малы сакол» (на словы Янкі Лучыны і музыку Рамана Козырава) — калыханка, яе я буду выконваць у паўфінале, дзе спаборнічаць за квіток у фінал будзе 21 удзельнік, і толькі 15 пройдуць далей. Спадзяюся, і я змагу апынуцца сярод іх. А ўжо для фіналу рыхтую кампазіцыю на словы Уладзіміра Маякоўскага і музыку Давіда Тухманава «Ноч» на першы дзень, а ў якасці замежнага хіта буду выконваць «Somebody to Love», аўтарам слоў і музыкі ў ёй з'яўляецца Фрэдзі Меркуры. І, адпаведна, з Наталляй Корж мы задумалі тры розныя вобразы, якія будуць дапаўняць кожную з гэтых гісторый.

— У якасці песні для паўфіналу ты выбрала калыханку. А табе ў дзяцінстве часта спявалі перад сном альбо чыталі казкі?

— Калыханкі спявала маці. Казкі ж мне чытала мая прабабуля. Часам яна нават сама іх складала.

Але ні з адным з персанажаў, гісторыі якіх Валерыя слухала перад сном, яна сябе не атаясамлівала. Бо сёння яна піша сваю казку, у якой галоўная гераіня — гэта дзяўчына-змагарка. Яна верыць у сваю мару і нічога не баіцца. І мне становіцца цікава: а за што, акрамя прызавых месцаў на сцэне, даводзілася змагацца нашай гераіні ў жыцці?

— Я з дзяцінства заўсёды хацела быць ва ўсім самай лепшай і імкнулася зрабіць максімум для гэтага.

— Ці не абумоўлена тваё жаданне «быць лепшай» тым, што бацька ў свой час пакінуў сям'ю?

— Мне даводзілася і даводзіцца быць моцнай. Безумоўна, маці ва ўсім мне дапамагала і цяпер падтрымлівае. Я па-філасофску ўспрымаю той факт, што ў маіх бацькоў не склаліся адносіны. З татам мы падтрымліваем сувязь, але кантактуем даволі рэдка. Магчыма, маё жаданне быць лепшай і бярэ пачатак якраз у гэтых абставінах...

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

На слыху!

ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЕ ТЭСЦІРАВАННЕ — НЕ ШКОЛЬНЫ ЭКЗАМЕН,

або Чаму ў айчынных тэстах няма «творчых» заданняў

Крыху больш за тыдзень аддзяляе беларускіх абітурыентаў ад важнага «старту». У нядзелю 14 чэрвеня яны прыйдуць у пункты правядзення ЦТ, каб здаваць беларускую мову. Улічыўшы вынікі апошняй прыёмнай кампаніі, дзяржаўная камісія ўнесла свае прапановы па далейшым удасканаленні адбору прэтэндэнтаў на студэнцкі білет. Мы сустрэліся з чалавекам, які ведае пра ЦТ практычна ўсё. Дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ расказаў, што зменіцца для абітурыентаў гэтага года...

ЦЭНТРАЛІЗАЦЫЯ ПА СУТНАСЦІ

— Мікалай Сцяпанавіч, гэта добра ці дрэнна, што створаная ў нашай краіне больш як 10 гадоў таму сістэма ЦТ застаецца фактычна нязменнай?

— Сапраўды, калі ЦТ толькі пачало ўкараняцца, цяперашнія выпускнікі яшчэ не хадзілі ў школу. Але на сёння гэта, напэўна, самы зразумелы і празрысты механізм, дзякуючы якому ўступная кампанія праходзіць вельмі арганізавана і спакойна. Кожны абітурыент добра ведае «правілы гульні» і разумее, што поспех на ЦТ залежыць выключна ад яго ўласных намаганняў. Усе ведаюць: каб паступіць на нейкі прэстыжны факультэт, патрабуецца не менш як 300 балаў, а на некаторыя і 350 балаў можа не хапіць. Добра, што адразу была закладзена 100-бальная шкала ацэньвання ведаў. Дарэчы, краіны, якія выкарыстоўваюць тэставыя тэхналогіі, як правіла, ужываюць 100- альбо 1000-бальныя шкалы ацэньвання. Складана выправіць «дзявятку» на «дзясятку», а вось дабраць хоць некалькі дадатковых пунктаў пры 100-бальнай сістэме — мэта, якая прымушае абітурыентаў працаваць. Тэст, магчыма, і не ўніверсальная, але найбольш аб'ектыўная і непрадузятая форма кантролю, якая дазваляе ацаніць рэальны ўзровень ведаў прэтэндэнтаў на студэнцкі білет і пастроіць іх рэйтынг паспяховасці. Асноўныя пастулаты, закладзеныя ў ЦТ, застаюцца нязменнымі, і я лічу гэта вялікім плюсам. Баюся паказацца нясціплым, але такой цэнтралізацыі экзаменацыйнай кампаніі, як у нас, няма больш нідзе. У Беларусі тэсціраванне з'яўляецца цэнтралізаваным не толькі па назве, але і па сутнасці.

Але думка, што сістэма ЦТ не змяняецца, не адпавядае рэчаіснасці. За 12 гадоў тэхналагічнае суправаджэнне прайшло далёка наперад: я маю на ўвазе не толькі тэхналогіі, што выкарыстоўваюцца для рэгістрацыі ўдзельнікаў тэсціравання, але і тэхналогіі апрацоўкі бланкаў адказаў.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Начны дазор

НЕПАЎНАЛЕТНІМ УВАХОД ЗАБАРОНЕНЫ!

Карэспандэнт «Чырвонкі» разам з інспектарамі па справах непаўналетніх адправілася ў начны рэйд па сталічных рэстаранах і кавярнях.

ЗАМЕСТ МІЛІЦЫІ Ў... БАЛЬНІЦУ

На заданне мы выходзім роўна ў 22 гадзіны. Раней не мае сэнсу, бо падлеткі паспеюць разгледзець міліцэйскую форму і ў памяшканне дакладна не зойдуць, а хуценька накіруюцца да дому.

— Добра, што вы не на абцасах. Магчыма, нават пабегаць давядзецца, — звяртаецца да мяне **Уладзімір ГАРДЗІЕЎСКІ, старшы ўчастковы інспектар па справах непаўналетніх Першамайскага РУУС.** — Падлеткі пры сустрэчы з намі сапраўднымі лёгкаатлетамі робяцца. Бягуць так хутка, што хоць сусветны рэкорд фіксуй! Аднойчы адзін так ірвануў ад нас, што нагу зламаў. Замест аддзялення міліцыі павезлі яго ў бальніцу.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Андрэй Касцючкоў уважліва правярае пашпарт наведвальніка кавярні.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
04 06 2015 г.

ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЕ ТЭСЦІРАВАННЕ — НЕ ШКОЛЬНЫ ЭКЗАМЕН

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сёння ў нас абсалютна ўсе працэсы аўтаматызаваны і абаронены ад вонкавага ўмяшання. Не спыняецца і праца над удасканаленнем зместу тэстаў, над фармулёўкамі заданняў. Спецыялісты інстытута штогод праводзяць абнаўленне зместу (мадэляў, тыпаў і формаў заданняў) тэстаў на 15-20%. Гэта робіцца як з мэтай пастаяннай ратацыі заданняў і максімальнага ахопу зместу ўсяго курса, так і для супрацьдзеяння прыёмам муштры абітурыентаў з боку асобных настаўнікаў і рэпетытараў. Так, летась па геаграфіі, хіміі, біялогіі, грамадазнаўстве была павялічана колькасць заданняў з невербальнай формай падтрымкі. Па матэматыцы і фізіцы праведзена карэкціроўка заданняў з улікам стандартных фармулёвак вучэбных дапаможнікаў; павялічана ўдзельная вага задач практыка-арыентаванай накіраванасці; па замежных мовах павялічана колькасць камунікатыўна-арыентаваных заданняў.

«Такой цэнтралізацыі экзаменацыйнай кампаніі, як у нас, няма больш нідзе. У Беларусі тэсціраванне з'яўляецца цэнтралізаваным не толькі па назве, але і па сутнасці».

Гэта толькі на першы погляд ствараецца ўражанне, што сістэма цэнтралізаванага тэсціравання «закансерваваная».

ЗАКРЫТЫЯ І АДКРЫТЫЯ ЗАДАННІ

— Больш за ўсё апанентаў у заданняў, дзе прапануюцца варыянты адказаў...

— Ва ўсіх краінах, дзе прымяняюцца тэставыя формы кантролю, ёсць заданні з выбарам адказу (частка «А»): ва Украіне, Літве, Казахстане, Азербайджане, Арменіі, Турцыі... Прэстыжная Лонданская школа эканомікі і палітычных навук прапануе сваім абітурыентам 30 заданняў тэста па матэматыцы выключна з выбарам адказу. І чамусьці праблема так званага ўгадвання іх не турбуе.

Многія краіны, у тым ліку і Казахстан, каб максімальна аўтаматызаваць працэс апрацоўкі тэставых матэрыялаў, прапануюць на экзаменах заданні толькі з выбарам варыянту адказаў. Мы сёлета пашырылі частку «В» у тэстах па рускай і беларускай мове на 2 заданні. Цяпер суадносіны адкрытых і закрытых заданняў дасягнулі сваёй мяжы, каб можна было захаваць аўтаматызаваную апрацоўку бланкаў адказаў у ранейшыя тэрміны.

Аўтаматызаваная апрацоўка адказаў — ключавы момант любога масавага працэсу кантролю ведаў, у тым ліку і цэнтралізаванага тэсціравання. Апрацоўка паўмільёна бланкаў адказаў менш чым за 14 дзён з друкаваннем імянных сертыфікатаў магчымая толькі дзякуючы добра наладжанай тэхналагічна-арганізацыйнай схеме. У гэтыя тэрміны бланкі адказаў не толькі апрацоўваюцца, але і неаднаразова верыфікуюцца, што дае гарантыю адсутнасці памылак пры іх апрацоўцы і выключае магчымасць тэхнічных збояў. Адмова ад дадзенай формы тэставых заданняў або істотнае павелічэнне часткі «В» пацягне неапраўданае павелічэнне часу апрацоўкі тэставых матэрыялаў, рызыку ўзнікнення тэхнічных памылак і складанасці ў падрыхтоўцы якаснага і надзейнага тэставага матэрыялу. Насамрэч, гэтыя прапановы можна рэалізаваць, толькі калі зноў перайсці да традыцыйнай формы ўступных іспытаў, з так званай ручной праверкай разгорнутых адказаў абітурыентаў.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Існуюць пэўныя законы пабудовы тэста, згодна з якімі ўзровень заданняў павінен узрастаць. Заданні часткі «А», дзе прапануюцца варыянты адказаў, правяраюць або ўменне лагічна разважаць, або ўменне аналізаваць і хутка рабіць выснову. Правільна сфармуляванае заданне патрабуе ўдумлівага аналізу і супастаўлення магчымых варыянтаў рашэння.

А для таго, каб тэст мог больш дакладна пабудаваць рэйтынг удзельнікаў тэсціравання, існуе вобласць «В», дзе няма адказаў на прапанаваныя пытанні і задачы. Заданні субтэста «В» у большай ступені дазваляюць дыферэнцаваць абітурыентаў з больш глыбокай падрыхтоўкай. Мы аналізавалі, як спраўляюцца абітурыенты з вобласцю «А» і «В», і пераканаліся, што карэляцыя іх паспяховасці ў рабоце над адкрытымі і закрытымі заданнямі вельмі высокая. Таксама мы ўстанавілі, што працэнт няправільных адказаў на аналагічныя заданні, прадстаўленыя ў частцы «А» і частцы «В», практычна аднолькавы, што абвяргае тэорыю пра магчымае ўгадванне. Калі ёсць пэўны прабел у ведах, значыць, ён ёсць. І тэст яго абавязкова высвеціць...

«Фактычна ЦТ выконвае функцыю таго самага «танометра» — «высвечвае» ў падрыхтоўцы беларускіх школьнікаў тыя ці іншыя праблемы... Тэст — гэта найперш сродак дыягностыкі, а не навучання!»

18 КРОКАЎ

— А якім павінен быць якасны тэст, з пункту погляду прафесіянала?

— Замежныя спецыялісты вылучаюць 12 крокаў пры стварэнні тэста. Лічыцца, што калі тэст будзе стварацца з захаваннем гэтых 12 правілаў, то ён будзе валідным. Валіднасць — гэта надзейнасць тэста. Мы ж пры стварэнні тэста абапіраемся на 18 крокаў, гэта значыць, што наш алгарытм стварэння тэстаў яшчэ больш падрабязны. Па-першае, тэст павінен максімальна поўна адлюстроўваць змест вучэбнай дысцыпліны. Па-другое, для яго адбіраецца такі кантрольны матэрыял, які з высокай верагоднасцю дазваляе вызначыць індывідуальны ўзровень падрыхтаванасці маладога чалавека і дыферэнцыяваць абітурыентаў. Зусім лёгкія заданні ў нашых тэстах не выкарыстоўваюцца, як не выкарыстоўваюцца і абсалютна невыканальныя заданні.

Час для выканання тэста падбіраецца доследным шляхам з улікам працягласці найбольш плённага часу працы. Тэарэтычныя даследаванні і практычныя назіранні сведчаць, што час, адведзены на выкананне тэста, не павінен перавышаць тры гадзіны, інакш абітурыенты стамляюцца, што не дазваляе ім якасна выконваць заданні. Ды і вынікі нашага маніторынгу пацвярджаюць, што па фізіцы і матэматыцы толькі асобныя ўдзельнікі ЦТ працуюць у аўдыторыі ўсе тры гадзіны. Затым тэсты абавязкова праходзяць апрабацыю ў ходзе пробнага і рэпетыцыйнага тэсціравання. Удзел у апрабацыі тэстаў бяруць і будучыя выпускнікі, і навучэнцы падрыхтоўчых аддзяленняў ВНУ, і студэнты-першакурснікі, якія здавалі пры паступленні ўступныя іспыты па тых жа прадметах. Мы заўсёды глядзім на працэнт выканання заданняў: скажам, калі з заданнем спраўляюцца 92% удзельнікаў выпрабавання, значыць, яго трэба ўскладняць, або, наадварот, калі з заданнем спраўляюцца ўсяго 10-12 працэнтаў удзельнікаў, значыць, гэтае заданне трэба спрашчаць або ўвогуле ад яго адмаўляцца.

Некаторыя апаненты абвінавачваюць тэсты ў тым, што ў іх бракуе творчасці. Я з гэтым поглядам не згодны. Практычных задач у нашых тэстах становіцца ўсё больш. З іншага боку, творчасць трэба развіваць у працэсе навучання, а не на экзамене.

У расійскія тэсты, што выкарыстоўваюцца на адзіным дзяржаўным экзамене, уключаюцца і заданні часткі «С», якія патрабуюць разгорнутых адказаў: доказаў, эсэ, кароткіх сачыненняў і г. д. Аднак, як паказалі даследаванні Расійскага цэнтра тэсціравання, карэляцыя паміж вынікамі заданняў «А», «В» і «С» настолькі высокая, што значымасць гэтых заданняў зусім невялікая. Па матэматыцы да выканання часткі «С» прыступаюць не больш як 50% школьнікаў, прычым большая палова з іх не атрымлівае ніводнага бала. Разам з тым, тая акалічнасць, што гэтыя заданні правяраюцца ўручную групай экспертаў, зніжае аб'ектыўнасць цэнтралізаванай формы выпрабаванняў.

ШТО АГУЛЬНАГА ПАМІЖ АДЭ І ЦТ?

— У нашай краіне ёсць шмат ініцыятараў сумяшчэння выпускных іспытаў у школе і ўступных у ВНУ, якія ківаюць у бок расійскага адзінага дзяржаўнага экзамену...

— Не ўсе разумеюць, што адзіны дзяржаўны экзамен і цэнтралізаванае тэсціраванне — гэта дзве прынцыпова розныя сістэмы. Нават многія педагогі не бачаць паміж імі прынцыповай розніцы. Я асабіста абсалютна перакананы, што аб'ядноўваць адначасова выніковую атэстацыю за курс сярэдняй школы з уступнымі экзаменамі — вялікая памылка. Хоць бы таму, што пры правядзенні выніковай атэстацыі выкарыстоўваецца нарматыўна-крытэрыяльны падыход, накіраваны на выяўленне вучэбных дасягненняў навучэнцаў, а пры цэнтралізаваным тэсціраванні — нарматыўна-арыентаваны, заснаваны на статыстычных метадах апрацоўкі вынікаў. Задача абітурыенцкага тэсціравання ў тым, каб размеркаваць абітурыентаў па ўзроўні падрыхтоўкі і суаднесці іх паміж сабой, пабудаваць больш дакладны рэйтынг прэтэндэнтаў на званне студэнта. Гэта конкурс сярод абітурыентаў з прэтэнзіяй на пэўнае месца, пажадана больш высокае, у агульным спісе прэтэндэнтаў.

А ў Расіі спрабуюць вырашаць адначасова дзве задачы: гэта прыкладна тое ж, што вызначаць адлегласць ад Мінска да Лондана з такім разлікам, што да Парыжа мы будзем лічыць адлегласць у кіламетрах, а ад Парыжа да Лондана — у мілях. А затым паспрабуем іх скласці...

КРЫЎДЗІЦЦА НА ЛЮСТЭРКА

— А што вы адкажаце тым, хто прапануе перагледзець сістэму падліку балаў удзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання? Маўляў, рыентаў моцна «кульгаюць», абвінавачваюць цэнтралізаванае тэсціраванне? Фактычна ЦТ выконвае функцыю таго самага «танометра» — «высвечвае» ў падрыхтоўцы беларускіх школьнікаў тыя ці іншыя праблемы...

Для школьных настаўнікаў, складальнікаў падручнікаў і тых, хто працуе над вучэбнымі праграмамі, вынікі тэсціравання павінны быць вельмі важным сігналам. Але сустракаючыся са школьнымі настаўнікамі, заўважыў, што апошнія пільна сочаць за зместам і формай тэставых заданняў і стараннa іх аналізуюць. І калі два-тры гады запар у тэстах адсутнічаюць заданні па асобных раздзелах, настаўнік на ўроку паціху згортвае з імі актыўную работу. Таму такі ўскосны ўплыў ЦТ на змест школьнай адукацыі і сапраўды мае месца.

Асобныя педагогі пачатак рэпетыцыйнага тэсціравання чакаюць зусім не для таго, каб на падставе бягучай паспяховасці і вынікаў іспытаў ліквідаваць прабелы ў ведах сваіх вучняў. На жаль, у навучальны працэс укараняюцца не самыя рацыянальныя і метадычна апраўданыя прыёмы працы. Заганная практыка вучыць матэматыку, фізіку, біялогію і іншыя прадметы па нашых тэстах — не самы лепшы метадычны прыём! Мы не стамляемся паўтараць, што нашы заданні адпавядаюць школьнай праграме, але тэсты не перадаюць усёй паслядоўнасці таго ці іншага курса, а таму рыхтавацца да цэнтралізаванага тэсціравання трэба не па тэстах, а па падручніку. Тэст — гэта найперш сродак дыягностыкі, а не навучання!

— Мікалай Сцяпанавіч, ужо не першы год вядуцца размовы пра тое, што трэба павялічыць колькасць прадметаў, якія абітурыенты могуць здаваць на ЦТ. Чаму не ідзяце насустрач?

— Мы таксама лічым, што трэба даць абітурыентам магчымасць здаваць ЦТ больш чым па дзвюх профільных дысцыплінах (акрамя абавязковага экзамену па дзяржаўнай мове). Гэта пашырыла б магчымасці для выбару і дазволіла б удзельнічаць у конкурсе на «сумежныя» спецыяльнасці.

На наш погляд, было б добра, калі б усе абітурыенты здавалі абавязковы іспыт і па беларускай, і па рускай мове, тым больш што ў нас дзве дзяржаўныя мовы. А затым яны маглі б выбіраць сертыфікат з найлепшым вынікам. Але, на жаль, нашы прапановы пакуль не знайшлі падтрымкі. Мы ўпэўнены, што вызначаць парогавае значэнне тэставага бала трэба пасля правядзення цэнтралізаванага тэсціравання па кожным прадмеце дыферэнцыявана (а не абвяшчаць яго перад ЦТ), а ў якасці альтэрнатывы існуючай практыцы можна было б даць права ўстановам вышэйшай адукацыі самастойна вызначаць парог тэставага бала па профільных прадметах.

Надзея НІКАЛАЕВА.

«Трэба даць абітурыентам магчымасць здаваць ЦТ больш чым па дзвюх профільных дысцыплінах (акрамя абавязковага экзамену па дзяржаўнай мове). Было б добра, калі б усе абітурыенты здавалі абавязковы іспыт і па беларускай, і па рускай мове».

Абнаві статус!

СОЦЫУМ ПРАЗ СЕЦІВА

Пры Цэнтральным камітэце Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі зусім нядаўна пачала працаваць Маладзёжная лабараторыя сацыялагічных даследаванняў. Мы сустрэліся з адным з яе кіраўнікоў, старшынёй Цэнтральнай кантрольнай камісіі БРСМ Алесяй ВІННІК, якая распавяла, навошта створаны гэты праект, і падзялілася першымі поспехамі ў яго працы.

— Вынікі сацыялагічных даследаванняў могуць быць вельмі карыснымі для любой арганізацыі, у тым ліку і маладзёжнай. Мы хочам ведаць, ці ў правільным кірунку рухаемся, ці падабаюцца маладым людзям тыя мерапрыемствы, што праводзім. Насамрэч, такая лабараторыя існавала і раней, мы ўсяго толькі абнавілі яе. Адна з галоўных асаблівасцей новага праекта — актыўная праца з новымі медыя. Калі раней выкарыстоўваліся толькі традыцыйныя метады — анкетаванне, апытальны ліст, то сёння гэта яшчэ і сродкі інтэрнэту. Дарэчы, першыя вынікі даследаванняў у сеціве абсалютна супадаюць з атрыманымі пры дапамозе традыцыйных спосабаў звесткамі.

«Месцы ў сярэдзіне спісу занялі тэлевізар, радыё, газеты і часопісы. А апошнія два месцы паміж сабой падзялілі стацыянарны тэлефон і друкаваная кніга».

— Праца сацыялагічнай службы прадугледжвае наяўнасць спецыялістаў, якія могуць скласці выбарку, правільна сфармуляваць пытанні...

— Так, маштабы работы ў нас сур'ёзныя. З актывістаў БРСМ ва ўсіх рэгіёнах краіны створана рэспубліканская апытальная сетка — гэта аснова нашай лабараторыі. Актывісты на месцах займаюцца непасрэдна працэдурай апытання і анкетавання. Кіруюць жа ўсім спецыялісты — людзі, якія прафесійна займаюцца сацыялогіяй. Існуе таксама савет лабараторыі, куды ўваходзяць кансультанты: навукоўцы з Акадэміі навук, Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ, іншых устаноў.

— Якія даследаванні ўжо былі праведзены?

— Мы вызначыліся, што гэты год будзе для лабараторыі ў пэўнай ступені эксперыментальным. Асноўная праца праводзіцца на мерапрыемствах пад эгідай БРСМ. Мы назіраем, як моладзь рэагуе на нашы акцыі, як успрымае тыя ці іншыя канцэпцыі і ідэі. Напрыклад, калі праводзіўся форум «Моладзь у ІТ», мы аналізавалі, якімі сацыяльнымі сеткамі карыстаюцца хлопцы і дзяўчаты. Большасць, зразумела, расійскай сеткай «ВКонтакте». На жаль, амаль ніхто не чуў пра існаванне беларускага сэрвісу «Vseti.by», які пакуль замарожаны. Дарэчы, мы якраз працуем са стваральнікамі гэтага сайта над адраджэннем праекта ў якасці беларускай моладзевай сацсеткі. На выставе «СМІ ў Беларусі» пыталіся ў маладых, без чаго яны не могуць уявіць свой дзень. На першым месцы — мабільны тэлефон, на другім — персанальны камп'ютар, на трэцім — інтэрнэт. Месцы ў сярэдзіне спісу занялі тэлевізар, радыё, газеты і часопісы. А апошнія два месцы паміж сабой падзялілі стацыянарны тэлефон і друкаваная кніга.

Акрамя таго, у інтэрнэце сочым за стаўленнем моладзі да грамадзянска-патрыятычнага выхавання. У прыватнасці, нядаўна праводзілі даследаванне на тэму патрыятызму. Яго вынікі даволі цікавыя. 40 працэнтаў маладых людзей і дзяўчат разумеюць пад словам «патрыятызм» любоў да Радзімы, роднага горада або вёскі. 34 працэнты лічаць, што гэта павага да Радзімы і гонар за яе. На жаль, толькі 6 працэнтаў лічаць, што гэта любоў да сям'і і блізкіх, а 12 працэнтаў апытаных вызначылі патрыятызм як любоў да нацыянальнай культуры.

— Ці могуць браць удзел у працы лабараторыі студэнты-сацыёлагі?

— Так, безумоўна, мы гатовыя супрацоўнічаць з тымі з іх, у каго ёсць жаданне папрактыкавацца. Пры недахопе практычных ведаў усё растлумачым і дапаможам у рэалізацыі любога даследавання: разам складзём пытанні, зробім выбарку. Дарэчы, мы самі займаемся навучаннем нашых спецыялістаў.

«40 працэнтаў маладых людзей і дзяўчат разумеюць пад словам «патрыятызм» любоў да Радзімы, роднага горада або вёскі».

— А якія праекты збіраецеся рэалізаваць у будучыні?

— Галоўным мерапрыемствам для нас сёлета стануць выбары Прэзідэнта краіны, падчас якіх Беларускі камітэт маладзёжных арганізацый будзе праводзіць «экзітполы». Ужо зараз мы апрацоўваем методыку, а хутка прыступім і да працы. Будзем праводзіць замеры аж да пачатку галасавання.

А ўвогуле, мы лічым, што лабараторыя можа з цягам часу перарасці ў цэнтр вывучэння праблем моладзі. Існуе пэўная складанасць: за апошнія гады па маладзёжнай праблематыцы не абаранялася сур'ёзных навуковых прац накшталт дысертацый. Але тэма вартая вывучэння, і мы паспрабуем паспрыяць яе развіццю.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.

Нельга забыць

ПА ДАРОЗЕ ПАМЯЦІ

На месцы стварэння мемарыяльнага комплексу «Трасцянец» для ўдзельнікаў гарадскога семінара «Цені Трасцянца» юныя экскурсаводы правялі першую эксклюзіўную экскурсію. Прызёры раённага конкурсу «Трасцянец — месца смутку. Трасцянец — месца памяці» паказалі гасцям знакавыя месцы тэрыторыі смерці.

...Адразу за аўтобусным прыпынкам «Вялікі Трасцянец» адыходзіць невялікая тупіковая вуліца, паабапал якой растуць вялікія таполі. Рукамі саміх ахвяр гітлераўцы заклалі алею, якую назвалі «Дарога смерці». Па ёй на расстрэл і спаленне прайшлі дзясяткі тысяч людзей.

— Мы ведаем шмат пра вайну, нашу Беларусь, наш народ, але гэтая экскурсія дазволіла нам даведацца яшчэ больш, — дзеліцца кіраўнік музея, настаўніца беларускай мовы і літаратуры гімназіі №25 г. Мінска Аліна Пахваленая. — Мы для сябе адкрылі новыя факты, новыя сведчанні. Прапусцілі ўсё гэта праз прызму нашай свядомасці і ў поўнай меры адчулі маштаб подзвігу беларускага народа — народа, на лёс якога выпалі самыя суровыя выпрабаванні, народа, які аказаў моцнае супраціўленне фашызму. І мы лічым сваім абавязкам шанаваць памяць пра тых людзей, якія набліжалі нашу Перамогу. Ведаць, каб расказваць іншым, каб перадаць гэту памяць наступным пакаленням.

6 верасня 1944 года ў газеце «Звязда» быў надрукаваны верш Максіма Лужаніна «Верш на крыві». Ён напісаны пад уражаннем убачанага і пачутага пасля вызвалення лагера смерці Малы Трасцянец:

...Вяла ў жыццё дарога нас адна,
Мы разам верылі, змагаліся, любілі.
Мы дзён не дажылі, мы спраў не дарабілі,
А вы, адпомсціўшы, зрабіце ўсё за нас.
Да урны брацкае, без дна, без берагоў,
Накрытай хмарным беларускім небам,
Няхай ідзе народ, з усіх краёў,
Каму нянавісці вучыцца трэба...

Юлія ХМЕЛЬ, вучаніца 11 класа гімназіі №25 г. Мінска.

Сакрэты поспеху

КВАДРАТНЫ БОБ І КРУГЛАЯ АЛІСА

Студэнты БДУ прадставілі свае стартапы на суд экспертаў

Стартап-рух у Беларусі набірае абароты: усё больш і больш з'яўляецца самых розных інкубатараў, краўдфандынгавых пляцовак (краўфандынг — калектыўнае фінансаванне), конкурсаў. Рухавіком інавацыйнага развіцця заўсёды было і застаецца студэнцтва, таму буйныя ўніверсітэты стараюцца затрымаць маладых вынаходнікаў у сябе. У Беларускім дзяржаўным універсітэце свой Цэнтр маладзёжных інавацый з'явіўся два гады таму. Нядаўна ў ім пабывалі эксперты — прадстаўнікі ВНУ Вялікабрытаніі, Малдовы, Украіны, Фінляндыі, Францыі, якія ацанілі праекты студэнтаў БДУ і далі стартаперам свае парады.

— Праект Цэнтра маладзёжных інавацый рэалізуецца сумесна з Еўрапейскім саюзам, — расказаў **рэктар БДУ Сяргей АБЛАМЕЙКА**. — Галоўная мэта — адшукаць перспектыўныя студэнцкія ідэі і дапамагчы іх развіць, знайсці інвестараў. Увогуле, сістэма вышэйшай адукацыі ў Беларусі цяпер накіравана на тое, каб развіваць у моладзі прадпрымальніцкія якасці, распрацаваны нават курсы, якія чытаюцца на ўсіх факультэтах.

Удзел у так званых крэш-тэстах (аналізе і апрабацыі ідэй спецыялістамі) узялі восем распрацовак у эканамічнай, адукацыйнай, сацыяльнай, інфармацыйнай сферах.

Супрацоўніца ўпраўлення міжнародных сувязяў БДУ Кацярына Се́ржан у суаўтарстве прадставіла праект пад назвай «BeHere». Ідэя нарадзілася, калі дзяўчына заўважыла, што сферы адукацыі і турызму цесна ўзаемазвязаныя. Задума заключаецца ў тым, што патэнцыйныя замежныя абітурыенты БДУ змогуць атрымліваць поўны спектр паслуг (трансфер, пражыванне, турыстычныя паслугі і паслугі перакладчыка, арганізацыю сустрэч з прадстаўнікамі ВНУ) у адным месцы. Акрамя таго, аўтары прапануюць такую магчымасць, як тэставы тыдзень ва ўніверсітэце, дзякуючы якому можна будзе на сем дзён адчуць сябе студэнтам і паглядзець на ўсе бакі дзейнасці навучальнай установы. Кацярына акцэнтавала ўвагу слухачоў на тым, што праект закліканы дапамагчы не толькі ўніверсітэту, але і айчыннаму турызму.

Студэнты фізфака Аляксандр Бядулін і Станіслаў Працэнка распавялі пра праект, які ўжо даўно і паспяхова рэалізуецца. Інструмент для сучасных інвестыцыйных кансультацый ProfitPAMM існуе ў выглядзе сайта. ПАММ-рахункі — папулярны ў краінах СНД метад інвеставання, калі карыстальнік праз інтэрнэт даверае свае грошы кіраўніку рахунку. Аналітычныя інструменты, распрацаваныя хлопцамі, дазваляюць інвестарам атрымаць звесткі больш як пра дзве тысячы кіраўнікоў рахункаў і дапамагаюць, што называецца, «не прагарэць». З іх праектам ужо пагадзіліся супрацоўнічаць уласнікі найбуйнейшых ПАММ-рахункаў.

Адукацыйны праект QualiMe падрыхтавала каманда з факультэта сацыякультурных камунікацый сумесна з Нацыянальным інстытутам адукацыі. Вольга Паўлюць, Мікіта Сеннікаў, Ірына Сіроціна і Сяргей Беразюк стварылі сайт, закліканы фарміраваць матэматычную культуру ў школьнікаў, абітурыентаў, студэнтаў і выкладчыкаў. Інтэрактыўны рэсурс складаецца з трох падраздзелаў. QualiHelpy ўяўляе сабой даведнік па дысцыплінах «Матэматыка» і «Асновы вышэйшай матэматыкі», які дазваляе прачытаць тэарэтычныя звесткі, убачыць прыклады рашэння задач і папрацаваць з інтэрактыўнымі мадэлямі. У падраздзеле QualiTesty карыстальнік можа прайсці тэст па якой-небудзь з тэм, убачыць правільнае рашэнне задачы, перачытаць тэарэтычныя раздзелы, якія патрабуюцца для рашэння. Трэці падраздзел QualiTester прызначаны для камп'ютарнай ацэнкі шэрагу характарыстык любога матэматычнага тэста.

Аўтары прапануюць такую магчымасць, як тэставы тыдзень ва ўніверсітэце, дзякуючы якому можна будзе на сем дзён адчуць сябе студэнтам і паглядзець на ўсе бакі дзейнасці навучальнай установы. Кацярына акцэнтавала ўвагу слухачоў на тым, што праект закліканы дапамагчы не толькі ўніверсітэту, але і айчыннаму турызму.

Зразумела, не абышлося і без праектаў у сферы ІТ. Дзмітрый Куратнік разам з камандай распрацоўшчыкаў стварыў гульню для смартфонаў і планшэтаў Changing the World. Праграма ўяўляе сабой сумесь галаваломкі і «платформера» (гульні, асновай якой з'яўляюцца скокі з платформы на платформу, лажанне па лесвіцах і г.д.) і распавядае пра гісторыю кахання выдуманых персанажаў: квадратнага Боба і круглай Алісы. Героі настолькі кахаюць адно аднаго, што вырашаюць змяніць сусвет, каб быць разам. За паўгода знаходжання ў краме гульнявых праграм Google Play яе ўстанавілі на свае дэвайсы больш як 40 тысяч чалавек.

Эксперты задавалі ўдзельнікам пытанні, дзяліліся ўласным досведам і гісторыямі іншых падобных праектаў. Асаблівую ўвагу звярталі на манетызацыю, кажучы, што ніводзін інвестар не пагодзіцца даваць грошы, пакуль не будзе ведаць, калі ён іх верне.

— У любым выпадку, якія б парады мы вам ні давалі, асабліва прыслухоўвацца да іх не трэба, бо мы ўсяго толькі выкладчыкі, — жартам зазначыў адзін з членаў замежнай дэлегацыі, **доктар філасофіі Дорын ФЕСЦЕУ** з Новага Бакінгэмпшырскага ўніверсітэта (Вялікабрытанія). — Галоўная ваша задача цяпер — увайсці ў кантакт з людзьмі, якія ўжо маюць свой бізнес і могуць вам дапамагчы фінансава або слушнай парадай. Галоўны прынцып для кожнага — не здавайцеся, імкніцеся да сваёй мэты, і ўсё ў вас атрымаецца.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
04 06 2015 г.

Цяжкасці выбару

ПЕРШЫНЕЦ ЦІ КАР'ЕРА,

або Як не ўпусціць галоўнае

Па звестках Белстата за 2014 год, першы шлюб у беларускіх жанчын прыпадае на 26,3 года (у мужчын — на 28 гадоў), а нараджэнне першага дзіцяці — на 27,4 года. Дарэчы, з кожным годам гэты «ўзроставы» паказчык павялічваецца. Яшчэ ў 2000 годзе дзяўчаты выходзілі замуж ва ўзросце 22,8 года, хлопцы жаніліся ў 25, а першае дзіця з'яўлялася на свет у сярэднім у 23,3 года. Сучасная моладзь не спяшаецца ствараць сем'і, а тым больш не спяшаецца з нараджэннем першынца. На першае месца выйшлі вучоба, а потым кар'ера...

— Выхаванне дзяўчат цяпер часта адбываецца па мужчынскім тыпе і скіравана на дасягненне поспеху найперш у прафесійнай сферы, — лічыць сямейны псіхолаг Святлана ДЗЕДАВА. — А ў выхаванні хлопчыкаў недастаткова ўвагі надаецца фарміраванню якасцяў будучага мужа і бацькі, гатовага ўзяць на сябе адказнасць за сям'ю — акцэнт у большай ступені робіцца на асабістыя дасягненні.

Але калі псіхіка чалавека здольная падладжвацца пад новаўвядзенні, то наша біялагічная сутнасць застаецца нязменнай. Здароўе не будзе цярпліва чакаць, калі маладая сям'я абзавядзецца кватэрай, машынай і павандруе па свеце. Нашы бабулі былі ў гэтым пытанні настроены адназначна: нараджаць трэба маладымі. Да і ўрачы з акушэркамі называлі 25-гадовых жанчын «старородящими». Але гэта непрыемнае слова тычылася толькі тых, у каго ў такім узросце былі першыя роды. Я і сёння здзіўляюся, як мая бабуля да 35 гадоў паспела нарадзіць дзевяць дзяцей.

— Найбольш спрыяльны ўзрост для нараджэння першынца — 20—28 гадоў, — падкрэслівае загадчыца родавага аддзялення 1-й клінічнай бальніцы г. Мінска Ганна КУПЧЫНА. — У жанчын яшчэ няма набытых захворванняў, няма метабалічнага сіндрому, добры гарманальны фон. А першыя роды пасля трыццаці лічацца познімі. У цяжарных жанчын у гэтым узросце часцей узнікаюць ускладненні, крывацёкі, заўчасныя роды і г.д.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Спачатку пісала на сайце, потым у часопісы, далей стала выпускаць свае кніжкі. Сама Маргарыта лічыць, што калі б не дзіця, яна ніколі ні стала б той, хто яна ёсць, бо яе чакала наперадзе праца бухгалтара.

Тое, што мацярынства пераварочвае свет жанчыны, не таямніца. Хтосьці бачыць у гэтым пагрозу здзяйсненню сваіх жыццёвых планаў, а нехта — новыя магчымасці. Так, Маргарыта не паспела адысці ад вясельных клопатаў, як дазналася, што пад сэрцам у яе б'ецца новае жыццё. Маладую жанчыну хвалявала, як яна, студэнтка прэстыжнай ВНУ, будзе сумяшчаць мацярынства з вучобай. Бацькі настойвалі на тым, каб дачка пасля нараджэння дзіцяці адразу працягнула навучанне, а яны абавязваліся ўзяць на сябе львіную долю адказнасці за выхаванне малога. Але жанчына «стала ў позу» і сказала, што хоча быць для свайго дзіцяці маці, а не госцяй. Цяжарнасць працякала добра, выкладчыкі паставіліся да яе з разуменнем. Бліжэй да родаў яна аформіла акадэмічны водпуск, але ва ўніверсітэт ужо не вярталася. Год мацярынства праляцеў як у сне: першыя зубкі, усмешкі, люлянне роднага чалавечка... Даходаў мужа хапала, таму Маргарыта магла цалкам прысвяціць сябе сыну. Кожны вечар яна чытала яму казкі. Аднойчы вырашыла сама скласці кароценькую казку і потым зачытаць яе малому. Дзіця, якому на той час было ўжо тры гады, ацаніла матуліны намаганні, і на другі дзень Маргарыта чытала яму ўжо новую казку ўласнага сачынення. Так неўзабаве дзяўчына стала дзіцячай пісьменніцай. Спачатку пісала на сайце, потым у часопісы, далей стала выпускаць свае кніжкі. Сама Маргарыта лічыць, што калі б не дзіця, яна ніколі ні стала б той, хто яна ёсць, бо яе чакала наперадзе праца бухгалтара.

Але бываюць і такія выпадкі, калі тэст паказвае дзве палоскі, а выбраннік махае ручкай, спяшаючыся да дзвярэй. З такой сітуацыяй сутыкнулася Караліна. З маладым чалавекам дзяўчына сустракалася з адзінаццатага класа, абое марылі пра сумесную будучыню. Пасля школы Караліна паступіла ў каледж, а хлопец адразу пайшоў працаваць. Праз два гады пара дазналася, што ў іх будзе дзіця. Хлопец, не доўга думаючы, прапанаваў дзяўчыне зрабіць аборт, спасылаючыся на негатоўнасць так адразу ўзяць на сябе адказнасць за выхаванне дзіцяці. Караліна сустрэла тую ж рэакцыю і з боку родных. Ад безвыходнасці яна ўжо была гатовая зрабіць ракавую памылку, але ўрач, які назіраў яе, усё ж змог пераканаць пацыентку не адмаўляцца ад дзіцяці. Цяжарнасць працякала вельмі цяжка, дзяўчына забрала дакументы з каледжа. Бацька дзіцяці больш не з'яўляўся на яе гарызонце. Сваякі лічылі яе проста няўдачніцай. Выжыць дзяўчыне дапамагла вера. Па некалькі разоў на тыдзень яна хадзіла ў царкву і прасіла ў Бога заступніцтва. Калі нарадзіўся сын, Караліне было 20 гадоў. Сёння ёй ужо 32, і яна нікольк не шкадуе пра свой выбар. Хлопчык вучыцца добра, займаецца футболам, а ў асабістым жыцці самой Караліны ёсць чалавек, з якім яна адчувае сябе шчаслівай.

Алена ЯКАВЕНКА,
студэнтка IV курса Інстытута журналістыкі БДУ.

НЕПАЎНАЛЕТНІМ УВАХОД ЗАБАРОНЕНЫ!

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Маладым наведвальнікам клуба ў нейкі момант стала соромна, што з-за іх пацярпела дзяўчына.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Вечар добры. Ваш пашпарт, калі ласка, — звяртаецца да хлопца ў капелюшы **інспектар па справах непаўналетніх Андрэй КАСЦЮЧКОЎ.**

— Вось, — працягвае дакумент наведвальнік невялічкай кавярні.

Міліцыянер уважліва глядзіць на дату нараджэння.

— Добра выглядаеце! Я б вам гадоў шаснаццаць даў, але ніяк не дваццаць два. Прыемнага адпачынку! — развітваецца міліцыянер.

Андрэй Касцючкоў патлумачыў, што часам вызначыць узрост чалавека вельмі цяжка. Адны выглядаюць старэй за свае гады, іншыя наадварот, не «дацягваюць» да іх. Таму лепей правяраць усіх «падазроных». Міліцыянеры падышлі яшчэ да трох чалавек, але ўсё было ў парадку.

— У нас тут дзяцей няма. Мы за гэтым сочым, — звярнуўся да нас адміністратар кавярні. — Гадзіну таму скончыўся канцэрт, і ўсе самыя маладыя сышлі.

ПА ЗАСЛУГАХ

Наступны прыпынак — кітайскі клуб-рэстаран. Увагу інспектараў адразу прыцягнуў столік на другім паверсе, за якім сядзелі два хлопцы. Як высветлілася, аднаму з іх семнаццаць гадоў. Паўналетнім Саша стане зусім хутка, праз месяц, але закон ёсць закон, паводле яго юнакам у такім узросце без суправаджэння дарослых забараняецца знаходзіцца ў забаўляльных установах пасля 22 гадзін.

— Толькі бацькам не тэлефануйце, — просіць хлопец. — Шуму будзе...

Але непрыемны званок быў зроблены. Хлопец расказаў, што праходзіць практыку на адным з заводаў і сёння хацеў адзначыць заканчэнне першага працоўнага тыдня. Кампанію практыканту склаў паўналетні калега, які адразу адзначыў, што знаёмы з Сашам адзін дзень і, зразумела, не ведаў, што ён такі малады.

— Нікога я спойваць не збіраўся! Паглядзіце на яго! Ён на ўсе трыццаць выглядае! — не сунімаўся знаёмы практыканта.

Тым часам да размовы далучылася афіцыянтка Кацярына, якая абслугоўвала гэты столік, і адміністратар рэстарана. На дзяўчыну інспектары складаюць пратакол за тое, што прадала непаўналетняму спіртное.

— Памылку сваю, вядома, прызнаю. Трэба было пашпарт спытаць! Закруцілася зусім, наведвальнікаў сёння шмат, — спрабуе знайсці апраўданне для сябе самой дзяўчына.

Папярэджанняў па адпаведным адміністрацыйным артыкуле няма, таму афіцыянтцы пагражае штраф ад 20 да 50 базавых велічынь. Каці, хутчэй за ўсё, дадуць па мінімуму: дзяўчына «папалася» ўпершыню.

— А куды знік ваш адміністратар? — раптам спытаўся Аляксандр Касцючкоў. — Хвіліну таму быў яшчэ тут!

Кацярына пабегла шукаць свайго начальніка, а інспектары патлумачылі, што патрэбен ён ім не проста для размовы. За тое, што ў рэстаране пасля дзесяці вечара знаходзіцца падлетак, «дастанецца» і ўладальніку ўстановы — штраф ад дзесяці базавых велічынь.

— Дырэктар вельмі дрэнна сябе адчувае, паехаў дадому. Мы можам яму патэлефанаваць! — прапанаваў вернуты назад адміністратар.

Але так нічога і не выйшла. Дырэктар, аказваецца, не разумее рускай мовы! Некалькі незразумелых слоў — і трубку на тым канцы паклалі.

Адны здалі свой пашпарт на візу, іншыя не носяць с сабою «важныя паперы», бо баяцца іх згубіць, а нехта спрабуе даказваць, што ўсе патрэбныя міліцыянерам дакументы... толькі што скралі!

— Заўтра а пятнаццатай гадзіне чакаю дырэктара рэстарана з перакладчыкам у аддзяленні міліцыі, — падсумаваў размову Уладзімір Гардзіеўскі.

Сашу прыехаў забіраць бацька. Практыкант атрымаў ад яго добрую ўзбучку, і абяцанне пазбавіць кішэнных грошай. Дакументы на хлопца інспектары накіруюць у камісію па справах непаўналетніх. Там на працягу месяца адбудзецца пасяджэнне, на якое выклічуць бацькоў і прадстаўнікоў навучальнай установы. На першы раз абыдзецца толькі папярэджаннем, але калі трапіць у падобную сітуацыю яшчэ раз — прыйдзецца заплаціць штраф ад 360 да 900 тысяч рублёў.

«ДОБРЫ ДЖЫН»

На гадзінніку — пачатак дванаццатай гадзіны. З кругласутачнай крамы выходзіць мужчына і працягвае літровую бутэльку піва дзвюм дзяўчатам. Уладзімір Гардзіеўскі накіроўваецца да гэтай тройцы.

— Я нікога не пабіў і нічога не разбіў! У чым маё злачынства? — не разумеючы, пытаецца мужчына гадоў сарака.

— А спіртное дзецям купляць — гэта не злачынства? — тлумачыць Уладзімір Гардзіеўскі.

— Але ж яны так прасілі! Нават «калі ласка» сказалі! — працягваў «добры джын». — І ўвогуле, той дзяўчынцы, — паказваючы на бялявую прыгажуню, — ужо ёсць 18! Яна пашпарт дома забылася!

Што толькі не здараецца з дакументамі, якія могуць дапамагчы інспектарам дазнацца пра ўзрост юных адпачывальнікаў! Адны здалі свой пашпарт на візу, іншыя не носяць с сабою «важныя паперы», бо баяцца іх згубіць, а нехта спрабуе даказваць, што ўсе патрэбныя міліцыянерам дакументы... толькі што скралі!

«Падлеткі пры сустрэчы з намі сапраўднымі лёгкаатлетамі робяцца. Бягуць так хутка, што хоць сусветны рэкорд фіксуй! Аднойчы адзін так ірвануў ад нас, што нагу зламаў».

— Мы прывыклі да такіх гісторый. Падлеткі, напэўна, добрыя сачыненні ў школе пішуць, — смяецца Андрэй Касцючкоў, — такое выдумляюць!

Іра і Света — сяброўкі. Вучацца на першым курсе ў каледжы лёгкай прамысловасці. Дзяўчаты паспяхова здалі адзін з залікаў і вырашылі гэта «адсвяткаваць». Праблемы знайсці таго, хто дапаможа ўсё арганізаваць, не ўзнікла. «Спагадлівых», як патлумачылі студэнткі, каля магазінаў заўсёды шмат!

— Вам, паважаны, за сваю дабрыню трэба будзе расплачвацца! Падобныя дзеянні трактуюцца як уцягванне непаўналетняга ў антыграмадскія паводзіны, — тлумачыць Уладзімір Гардзіеўскі. — А гэта — штраф ад 10 да 20 базавых велічынь.

Мужчына схапіўся за галаву: «Схадзіў па хлеб, называецца». Тым часам усе ўдзельнікі гісторыі накіраваліся ў аддзяленне міліцыі для запаўнення пратаколаў і чакання бацькоў непаўналетніх. На першы раз сітуацыя для дзяўчат скончыцца, хутчэй за ўсё, папярэджаннем і прафілактычнай гутаркай. Бацькам яшчэ раз нагадаюць, дзе павінны знаходзіцца іх непаўналетнія пасля 23 гадзін і раскажуць пра дзеянне артыкула Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях Рэспублікі Беларусь «Невыкананне абавязкаў па суправаджэнні ці забеспячэнні суправаджэння непаўналетняга ў начны час па-за межамі жылля».

— Не ўсе падлеткі, якія гуляюць ноччу па горадзе, п'юць ці прымаюць псіхатропы, — тлумачыць Аляксандр Касцючкоў. — Але знаходзіцца так позна на вуліцы небяспечна ў першую чаргу для іх саміх! Невядома, каго можна сустрэць па дарозе і хто ведае, што ў незнаёмца ў галаве?!

...Інспектары пайшлі працаваць далей, а я накіравалася дадому. Каля метро заўважыла кампанію падлеткаў, якая вельмі гучна нешта абмяркоўвала. Хлопцы і дзяўчаты выраслі, куды лепей пайсці, каб не «спаліцца». Адны крычалі, што «гэта кавярня вельмі мажорная і малалетак туды нават на парог не пусцяць», другія прапаноўвалі пайсці ў «праверaны» бар і сесці, як заўжды, за столік у кутку. Спадзяюся, гэты стол быў заняты, а бацькі своечасова апамяталіся, што іх дзяцей няма дома...

Кацярына АСМЫКОВІЧ.

Школа талентаў

СПАСЦІГНУЦЬ МАГІЮ МУЗЫКІ

...Старыя дзверы з просценькай шыльдай, па драўлянай лесвіцы падымаемся наверх. Перад вачыма — стойка, аздобленая металам, на заднім фоне намаляваны ноты. Але гэта не проста дэкарацыя, а ўступ да песняроўскай «Белая Русь ты мая». Барабаны чутны ўжо на ўваходзе, а за імі — знаёмцеся: Аляксандр Мінец, заснавальнік сталічнай школы музычнага навучання «МузШок», удзельнік шматлікіх джазавых праектаў і пераможца конкурсу «Барабанны Біт».

— Як справы, Аляксандр?

— А нядрэнна, людзі ідуць, выкладчыкі працуюць. Хто хоча займацца музыкай, той займаецца. Сам разумееш, жыццёвыя клопаты — часовыя, а музыка — яна назаўжды (*смяецца*).

Напрамкі і стылі ў нас вызначаюць вучні і толькі яны. Спрабуюць выконваць усё — ад айчыннай поп-музыкі да замежнага металу. Дарэчы, творчасць гурта «Металіка» ледзь не самая папулярная для вывучэння.

— На якіх інструментах большасць хоча навучыцца іграць?

— Вядома ж, на гітары! Здаецца, што ўсе хочуць ёй валодаць, мабыць, ёсць нешта асаблівае ў гэтым інструменце... Але і на занятках па вакале і барабанах вучняў таксама хапае. Дарэчы, амаль палова тых, хто займаецца ў нас на барабанах, — дзяўчаты. І ў іх зусім нядрэнна атрымліваецца!.. Ды мы хіба што немаўлят не бяром вучыцца — занадта яны сур'ёзныя! Хочаш — і ты давай да нас.

— Трэба падумаць... А што такога выключнага можаце прапанаваць?

— Апроч валодання інструментамі і вакалам, развіваем слых, займаемся тэорыяй і гісторыяй музыкі. Да кожнага шукаем асабісты падыход. Праводзім майстар-класы, на якія запрашаем «крутых» музыкаў. Але самае галоўнае, на мой погляд, гэта тое, што мы сваіх вучняў яшчэ і стымулюем, праводзячы анлайн-конкурсы. Напрыклад, да «МузШоу» здымаем відэа з музычнымі нумарамі навучэнцаў. Потым будзе галасаванне на нашым сайце, выявім пераможцаў, а ў якасці ўзнагароды ім будуць абанементы на пэўную колькасць заняткаў. А ў сярэдзіне і напрыканцы кожнага года праводзім фэсты ўжо афлайн, апошні вялікі канцэрт-справаздача, дарэчы, прайшоў зусім нядаўна — у канцы мая.

— Дык вы амаль што прадзюсарскі цэнтр?

— Вось гэта ты ўжо загнуў! Я звычайна кажу так: мы — школа-студыя, якая адкрывае для навучэнцаў больш магчымасцяў у свеце музыкі. Хаця б таму, што мы маем добрыя стасункі з арганізатарамі фестываляў і гуказапісваючымі студыямі. Пагадзіся, гэта нядрэнныя перспектывы для навучэнцаў, якія вырашылі займацца музыкай сур'ёзна, напрыклад, удзельнічаць у конкурсах ці запісваць альбомы.

...Увечары таго ж дня я ўпершыню за апошні час змахнуў пыл са сваёй гітары. Рукі напачатку не слухаліся, але паціху нешта ўспомнілася, і працэс пачаў прыносіць задавальненне. Музыка — нібы магія, дзякуючы ёй адчуваеш сябе сапраўдным чараўніком. Нават калі пакуль не ўсё атрымліваецца, заўсёды ёсць магчымасць сказаць: «Я не чараўнік, я яшчэ толькі вучуся».

Міхаіл ФРАЛЯНКОЎ.

Аб'ектыў

ФАТОГРАФ, ЯКІ БАЧЫЦЬ ДУШОЙ

Гісторыя дзяўчыны з неабмежаванымі магчымасцямі

У культпаходы апошнім часам выбіраюся не часта. Але ўдала. З нядаўняга — пашчасціла наведаць сталічную фотавыставу «Твар, які займае кветку», дзе былі прадстаўлены здымкі, зробленыя дзяўчынай на тэлефон. На першы погляд, нічога незвычайнага. Вось толькі аўтарка фота Наталля КАВАЛЕВІЧ не бачыць з нараджэння. Што не замінае ёй весці актыўны лад жыцця. Наташа вучыцца на дзённым аддзяленні юрфака БДУ (у яе гэта ўжо другая вышэйшая адукацыя), ходзіць у тэатры, самастойна наведвае краму. У шчырай размове з журналістамі дзяўчына падзялілася сваім бачаннем таго, чаго менавіта ёй не хапае ў горадзе і як трэба ацэньваць творчасць людзей з асаблівасцямі развіцця.

Наш карэспандэнт паспрабавала адчуць, як успрымаюць свет тыя, хто не бачыць.

«Мару працаваць па спецыяльнасці...»

Наташа родам з Брэста. Там жа яна атрымала першую вышэйшую адукацыю: вучылася на гістфаку Брэсцкага дзяржуніверсітэта імя А.С. Пушкіна. Дзяўчына прызналася, што заўсёды цікавілася гісторыяй. Праўда, папрацаваць па прафесіі як след не давялося. Настаўніцай у школу не бралі. Уладкавалася ў мясцовую бальніцу выкладаць гісторыю дзецям, што ляжаць у стацыянары. Але доўга там не затрымалася. Заробак нізкі, дый, на думку Наташы, ведаў ад такіх заняткаў у школьнікаў не дабаўляецца. Урок цягнецца дваццаць хвілін, заданне на дом даваць нельга, наведванне неабавязковае. Дзяўчына ўзгадвае, што, каб сабраць дзяцей на заняткі, абыходзіла бальнічныя палаты і пыталася, ці не хоча хто-небудзь зазірнуць на ўрок.

Па дыплом юрыста Наташа паехала ў сталіцу.

— Мне на той момант 26 гадоў было, хацелася большай самастойнасці, пажыць асобна. А права — гэта другая мая «слабасць» пасля гісторыі, — тлумачыць яна.

— І дзе працаваць потым збіраешся? Ужо нагледзела месца?

— Пайду, куды возьмуць. Зразумела, па спецыяльнасці буду шукаць што-небудзь. Ці чула пра завод «Святлопрыбор»? Так, але нават калі б было моцнае жаданне там працаваць, мяне не возьмуць: з рукой праблемы (у Наташы ДЦП. — **Аўт.**) Увогуле, мне здаецца ненатуральным існаванне такіх адасобленых устаноў. У нас жа як звычайна? Дзіця-інвалід, пакуль зусім малое, гадуецца дома. Потым яго аддаюць у спецыялізаваную школу-інтэрнат. Калі не лічыць канікул, такое дзіця з іншымі амаль не перасякаецца. А ў выніку да суіснавання ў рэальным жыцці не гатовыя ні інваліды, ні навакольныя людзі.

У жыцці і творчасці — без ярлыкоў

Фатаграфаваць дзяўчына пачала, калі ёй падарылі айфон (у яе выпадку мабільнік ад Apple не «панты», а неабходнасць: тэхніка гэтай маркі лепш за астатнія прыстасавана для невідушчых людзей). Уключаеш камеру — і тэлефон агучвае, на што яна наведзена. Дзяўчыне было цікава, ці атрымліваецца што-небудзь. Яна паказвала здымкі знаёмым і пыталася пра іх думку. У выніку эксперымент ператварыўся ў хобі. Пакуль размаўлялі, гарталі Наташыну тэлефонную галерэю: братаў шлюб, парк, гарадская прастора...

Фота Надзеі БУЖАН.

Невідушчы чалавек можа ўсё. І фатаграфаваць таксама.

— Як ты разумееш, калі трэба сфатаграфаваць? — цікавіцца наш фотакарэспандэнт Надзея.

— Па-рознаму бывае. Днямі, напрыклад, было вельмі добрае надвор'е і мне захацелася зняць неба.

Дакладнае апісанне ўжо зробленага фота робіць спецыяльная праграма. Яна можа распазнаць канкрэтныя аб'екты, колер. Праўда, з перакладам бываюць казусы. Наташа неяк сфатаграфавала сваю знаёмую — худзенькую, з кароткай стрыжкай, у джынсах. Тэлефон агучыў, што на здымку... хлопец.

— У мяне таксама кароткія валасы, але мяне праграма распазнае як дзяўчыну. Значыць, мой стыль адзення не хлапчуковы, гэта радуе, — усміхаецца наша суразмоўца.

— На тваю думку, як трэба ацэньваць творчасць людзей з псіхафізічнымі асаблівасцямі ў развіцці?

— Ведаеш, мне не падабаецца гэтая фармулёўка. Яна некарэктная. У ёй аб'ядноўваюць псіхічныя і фізічныя парушэнні, што навакольнымі ўспрымаецца так: ага, калі ў цябе з целам не ўсё добра, дык і з галавой праблемы будуць... А што датычыцца творчасці, то да яе ацэньвання трэба падыходзіць аб'ектыўна. Як і з маімі фота: штосьці ўдалае, штосьці не. З тэатрам інвалідаў тое ж самае. Сыгралі добра — малайцы, не — атрымайце «па шапцы».

Пра шопінг, тэатр і падарожжы

Ад размовы пра творчасць пераходзім да бытавых пытанняў. Наташа кажа, што ёй хацелася б змяніць абслугоўванне ў крамах адзення:

— Чула, што ў Японіі невідушчы можа патэлефанаваць аператару і з уключанай камерай хадзіць па аддзеле, каб той расказваў, што перад чалавекам. Добра было б, калі б прадаўцы тлумачылі, што модна і якія рэчы пасуюць менавіта табе. Ці прызначылі б спецыяльных кансультантаў, якія распрацоўвалі б чалавеку пэўны імідж. Я не кажу, што гэта паслуга павінна быць бясплатнай, але яна будзе вельмі запатрабаваная, прычым не толькі сярод невідушчых.

Дзяўчына сама выбірала сабе вопратку толькі аднойчы — калі з сяброўкай ездзіла ў Германію. У асноўным адзенне набывае мама.

У банк, на пошту, па прадукты, на факультэт — Наташа ўсюды ходзіць самастойна. І сваім прыкладам даказвае, што інваліды могуць жыць насычана і цікава. Тым больш сёння існуе шмат прыкладных праграм для смартфона для невідушчых: вызначальнік грашовых купюр, колеру, праграма для сканавання і распазнавання тэксту, GPS-навігацыя. Ёсць спецыяльныя «чыталкі» на тэлефон: закідваеш звычайны электронны дакумент, і табе яго агучваюць. Адзіны мінус — праграмы платныя. Кожная каштуе ад 10 да 30 долараў. З улікам таго, што Наташына пенсія складае 1 мільён 740 тысяч, гэта не так танна. «Грошай у інваліда расходуецца значна больш, чым у звычайнага чалавека, — заўважае дзяўчына. — Лекі, напрыклад, дарагія. Я ў сваю пенсію не ўкладваюся, таму пастаянна ў пазыках».

У вольны час Наталля любіць чытаць, хадзіць у кіно і тэатр, калі ёсць з кім:

— Мінулай вясной была на спектаклі «Казіны востраў» Маладзёжнага тэатра. Спадабалася... У Гродне неяк на «Чорную панну Нясвіжа» трапіла — шыкоўная пастаноўка.

— Ты ж не бачыш, што адбываецца на сцэне...

— Чаму ўсе перабольшваюць ролю зрокавага і прымяншаюць значэнне таго, што перадаецца іншымі сродкамі? Я звяртаю ўвагу на інтанацыю, эмацыйную гульню акцёраў, музычнае суправаджэнне, спецэфекты.

Яшчэ адно Наташына хобі — падарожжы. Па сакрэце расказала, што, калі пашанцуе, пабывае гэтым летам у Амерыцы. Не ведаю, якая культурная праграма яе там чакае, але дакладна магу сказаць адно — дадому Наташа прывязе дзясяткі ўласных здымкаў заакіянскіх краявідаў.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
04 06 2015 г.

Гарызонты

ЭКАНОМІКА ШУКАЕ ЛІДАРАЎ

...Усё змяшалася ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце. За аўдыторнымі партамі — выкладчыкі нароўні са студэнтамі. Крэйдай на зялёнай дошцы — не сцертая яшчэ формула разліку патрэбнасці ў абаротных сродках, а на экране побач — партрэт Уладзіміра Караткевіча ў «зялёным» студэнцкім юнацтве. «Выкладчыкі» — у вышыванках, замест лекцыі — «літгасцёўня».

Гэткія хітрыкі часопіса «Маладосць». І дакладна невядома, ці быў гэта піяр-крок у рамках падпіснай кампаніі, ці ўжо распачатае святкаванне сёлетняга 85-годдзя з дня нараджэння ўлюбёнца ўсіх рамантыкаў Уладзіміра Караткевіча, ці проста падарунак установе, у прыватнасці кафедры нацыянальнай эканомікі і дзяржаўнага кіравання з нагоды адкрыцця новай спецыяльнасці. Спынімся, прынамсі, на апошнім пункце.

— Эканоміка краіны мае вострую патрэбу ў сапраўдных гаспадарчых лідарах, здольных мысліць стратэгічна і творча, прымаць рацыянальныя кіраўніцкія рашэнні, — гаворыць **Алена ДОРЫНА, загадчык кафедры нацыянальнай эканомікі і дзяржаўнага кіравання БДЭУ**, ініцыятар увядзення новай спецыяльнасці «Нацыянальная эканоміка» з прысваеннем кваліфікацыі «эканаміст-аналітык». — Ва ўмовах развіцця і ўдасканалення эканамічных стасункаў значна ўзрастае роля рэгіёнаў, і гэта абвастрае праблему недахопу высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія валодалі б нетрадыцыйным эканамічным мысленнем, маглі б даваць ацэнку і прагноз эвалюцыі і трансфармацыі таго ці іншага рэгіёна, яго рэсурснаму, навукова-тэхнічнаму, дэмаграфічнаму і працоўнаму патэнцыялам. Нам патрэбны фінансавыя аналітыкі, кемлівыя і надзейныя практыкі, якія, працуючы ў рэгіёнах, як мінімум валодаюць асновамі макра- і мікраэканомікі, менеджменту і права, псіхалогіі і маркетынгу, інфарматыкі і статыстыкі. Час адміністратараў старой фармацыі сыходзіць у нябыт. Дык чаму б не адкрыць сучаснай моладзі магчымасць рэалізацыі яе творчага патэнцыялу ў такой неабходнай грамадству і дзяржаве сферы?

Што такое нацыянальная эканоміка? Пытанне, на якое так проста не адкажаш. А калі ўзяць гэты выраз у двукоссе? Тады гэта спецыяльнасць, якая арыентуе на глыбокае веданне не сухіх фармулёвак і абстрактных схем, што дзейнічаюць толькі на старонках падручнікаў, а тэндэнцый, заканамернасцей, асаблівасцей развіцця эканомікі канкрэтнай краіны, канкрэтнага рэгіёна.

Галоўная мэта новаўвядзення БДЭУ — на фундаменце міждысцыплінарнага падыходу вучыць студэнтаў эканамічным паводзінам, метадам і працэдурам кіравання, у тым ліку і ў надзвычайных і крызісных сітуацыях. Будучыя спецыялісты будуць авалодваць сістэмнымі ведамі ў галіне дзяржаўнага кіравання малым і сярэднім бізнесам і знешнеэканамічнай дзейнасці. Практыка-арыентаваны працэс навучання прадугледжвае дзелавыя гульні і тэматычныя дыскусіі за «круглым сталом» з кіраўнікамі буйных прадпрыемстваў.

Святлана ДЗЯНІСАВА.

Свая кішэня

ПАМІЖ ЖАДАННЕМ І БЮДЖЭТАМ

На што і як жывуць студэнты?

Студэнцкія гады прынята лічыць аднымі з самых цікавых і насычаных у жыцці кожнага: ты ўжо нібыта і дарослы, але ўсё яшчэ вольны ад працы, ды і сям'ю стварыць не паспеў. Адзіны клопат — вучоба. Але што там — наведвай лекцыі, здавай заданні і своечасова рыхтуйся да экзаменаў. Праўда, не ўсё так проста, калі ты малады, поўны сіл і энтузіязму, бо табе хочацца ўсяго і адразу: вандраваць, купляць прыгожыя рэчы, а пасля заняткаў адпачываць у модных месцах. Вядома, што стыпендыі на ўсё не хапае (а калі вучышся на платным, дык і ўвогуле яе не маеш). Сённяшнія студэнты падзяліліся інфармацыяй пра сумы, якія яны трацяць за месяц, і пра тое, на што ідуць гэтыя грошы.

Віталіна Бандаровіч, І курс Інстытута журналістыкі БДУ:

— Мой месячны бюджэт не перавышае мільён рублёў (стыпендыя + крыху даюць бацькі). Купляю толькі самае неабходнае: праязны на метро, ежу, нешта з бытавой хіміі. Жыву ў інтэрнаце, хоць і трапіла сюды цудам, бо не маю льгот. Падчас зімовых канікул я знайшла часовую падпрацоўку, каб купіць падарункі на святы блізкім і сябрам. Я ўвогуле намагаюся радаваць сяброў падарункамі, часам нават эканомлю дзеля гэтага.

Арцём Марчук, ІІІ курс біятэхнічнага факультэта Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта:

— Вучуся на платнай аснове, таму стараюся эканоміць. Звычайна трачу 600-800 тысяч рублёў у месяц. Пры гэтым дадому езджу кожныя выхадныя, каб узяць крыху ежы. Паколькі сам гатаваць не люблю, хаджу ў сталовую. Перад паходам у краму раблю спісы, гэта дапамагае не купляць лішняга. Яшчэ я для сябе вырашыў: ніколі не траціць грошы на алкаголь, цыгарэты, фастфуд. Гэта зберагае не толькі сродкі, але і здароўе. Не магу не адзначыць і тое, што ў нашай ВНУ ўсім даюць інтэрнат. Зноў жа — істотная эканомія!

Анастасія Рудопіс, V курс лячэбнага факультэта БДМУ:

— Трачу каля 3,5 мільёна. Гэта без уліку грошай на вопратку, а таксама рэпетытара па нямецкай мове. Галоўным чынам сродкі ідуць на ежу, а таксама на паходы ў кавярні, кіно, тэатры, на канцэрты і іншае. Акрамя таго, я люблю купляць кнігі, рабіць падарункі. Раней падпрацоўвала медсястрой. Хацелася незалежнасці ад бацькоў, думала, што змагу сама сябе забяспечыць. Але ў хуткім часе кінула, таму што зарабляла мала, а праца патрабавала шмат часу і адказнасці.

Павел Варанько, ІІІ курс Інстытута журналістыкі БДУ:

— Я мінчанін, але жыву не з бацькамі. Некалькі гадоў таму пераехаў да бабулі, каб даглядаць яе. Паколькі бацькі аплачваюць маё навучанне ва ўніверсітэце (а гэта немаленькая сума), я вырашыў крыху спрасціць ім задачу — пачаў самастойна зарабляць грошы на жыццё. У жніўні ўладкаваўся ў «МакДональдс». Працую ў вольны ад вучобы час, зарабляю крыху менш за два мільёны рублёў. Цяпер сам плачу за праязны білет, інтэрнэт, тэлефон, і, вядома, ежу. Час ад часу хаджу ў кавярні, купляю нешта з адзення. Але, самае галоўнае, з кожнай заработнай платы я адкладваю грошы на паездку ў Швейцарыю, пра што даўно мару.

Юлія Шаўкова, IV курс будаўнічага факультэта БНТУ:

— Кожны месяц трачу каля двух мільёнаў рублёў з улікам таго, што жыву ў інтэрнаце. Я падпрацоўваю, калі ёсць магчымасць і час. Грошы ў асноўным ідуць на ежу, раздрукоўкі для вучобы, аплату за тэлефон. Хаджу ў клубы, кавярні, але нячаста. Як і ўсе дзяўчаты, люблю купляць новае адзенне, але звычайна раблю гэта на распродажах. Шчыра кажучы, зусім не ўмею эканоміць. Часам нават займаю грошы да стыпендыі або зарплаты.

Юлія Ляхавец, IV курс Віцебскага дзяржаўнага індустрыяльна-будаўнічага каледжа:

— Звычайна мне хапае 1,5 мільёна, стараюся больш у бацькоў не браць, яны і так плацяць за маё навучанне. Купляю ежу. Калі хачу набыць штонебудзь больш істотнае, эканомлю, адкладваю невялікія сумы. Хацелася б падпрацоўваць, але баюся, што гэта будзе перашкаджаць вучобе, а яна — мой галоўны занятак на дадзеным этапе жыцця.

Вадзім Пайвін, ІІІ курс біялагічнага факультэта БДУ:

— Я бюджэтнік, але ў гэтым семестры, як і ў мінулым, на жаль, «завалiў» экзамен, таму атрымліваў толькі сацыяльную стыпендыю — каля 400 тысяч рублёў. Якія-ніякія, але грошы, і лішнімі яны не былі! Увогуле за месяц трачу каля двух мільёнаў, калі не ўлічваць тое, што здымаю кватэру (за яе плаціць мама). Грошы ідуць на ежу, праезд, камунальныя паслугі. Маю дрэнную звычку — куру цыгарэты, на гэта як мінімум 200 тысяч у месяц ідзе. Ёсць у мяне хобі, якое таксама патрабуе пэўных затрат, — ралявыя гульні. Для іх патрэбны пэўная экіпіроўка, спецыяльныя касцюмы, а гэта таксама каштуе грошай.

«Я для сябе вырашыў: ніколі не траціць грошы на алкаголь, цыгарэты, фастфуд. Гэта зберагае не толькі сродкі, але і здароўе».

...Нягледзячы на рэжым пастаяннай эканоміі, характэрны, як бачна, для многіх, студэнцкае жыццё можна зрабіць цікавым і незабыўным. Проста трэба ўмець карыстацца ўсімі магчымасцямі, якія з'яўляюцца. Напрыклад, для студэнтаў існуе зніжка на ўваход у многія музеі і на выставы. Не ўсе ведаюць, што ў прафкамах навучальных устаноў можна атрымаць бясплатныя білеты ў тэатр ці абанемент на наведванне басейна. Таксама спецыяльна для студэнтаў арганізоўваюцца экскурсіі на льготных умовах, звесткі пра іх можна знайсці на інфармацыйных стэндах або ў сацыяльных сетках. Таму пры вялікім жаданні і зусім невялікім бюджэце можна здзейсніць многае.

Ганна КУРАК, студэнтка ІІІ курса Інстытута журналістыкі.

На адной хвалі

СЛУХАЙ НАС, БУДЗЬ «INTER'АКТЫЎНЫМ»!

Усім знаёмая сітуацыя, калі хочацца проста адпачыць. І тут ёсць розныя спосабы. Адзін з самых папулярных — радыё. Усе яго слухаюць. Але не кожны задумваецца, якое жыццё віруе там, па-за дынамікамі, як ствараюцца праграмы на розны густ і хто яны, пазітыўныя вядучыя? Пра гэтыя сакрэты нам расказала загадчык вучэбнай тэлестудыі кафедры журналістыкі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы, галоўны рэдактар студэнцкай радыёстанцыі «Inter'Актыў» Дар'я КУРАС.



Дар'я Курас за працай.

— Як узнікла ідэя арганізаваць радыё?

— Яна з'явілася нечакана. Мы вярталіся з Мінска, акрыленыя перамогай у конкурсе на найлепшую ўніверсітэцкую інфармацыйную прастору. Ехалі ў аўтобусе чатыры гадзіны і за гэты час паспелі абмеркаваць шмат цікавых ідэй, у тым ліку і стварэнне ўласнага студэнцкага радыё і тэлебачання пры кафедры журналістыкі. У выніку ўтварыліся дзве каманды, якія па вяртанні ў Гродна адразу кінуліся ў «бой».

Радыёстанцыя «Inter'Актыў» з'яўляецца карпаратыўным радыё. Гэта дазваляе ствараць свае праграмы, кіраваць арганізацыяй мерапрыемстваў, рэкламай, падборам супрацоўнікаў, матэрыяльна-тэхнічным забеспячэннем студэнтаў з розных факультэтаў.

— Які спектр тэм вы ахопліваеце?

— Максімальна шырокі, які можа зацікавіць сучасных студэнтаў, дарэчы, не толькі нашага ўніверсітэта. Гэта і навіны, і музычныя праграмы, і рэцэнзіі на фільмы і тэатральныя пастаноўкі, і ўнікальныя факты пра герояў мінулага і сучаснасці, і яркія і гучныя падзеі ў свеце спорту, і звесткі аб рэкордах з кнігі Гінеса, і г.д. За кожнай перадачай замацаваны пэўны дзень выхаду і вядучыя. Увогуле штодзень у эфір выходзіць па чатыры-пяць перадач.

— А хто вашы слухачы?

— Мэтавая аўдыторыя «Inter'Актыва» — гэта студэнты, магістранты і аспіранты чатырох устаноў вышэйшай адукацыі Гродна. У якасці патэнцыяльных слухачоў мы бачым маладых людзей ва ўзросце ад 15 да 30 гадоў, перш за ўсё моладзь Гродзенскай вобласці.

Каб даведацца, чаго чакае наша мэтавая аўдыторыя ад гэтага праекта, мы правялі апытанне сярод студэнтаў розных курсаў і факультэтаў ГрДУ. Высветлілася, што большую частку вольнага часу практычна ўсе нашы студэнты праводзяць «ВКонтакте». Гэта сацыяльная сетка і стала пляцоўкай для вяшчання. У нас ёсць пастаянныя слухачы, якія падпісаны на ўсе абнаўленні, ёсць удзельнікі, якія проста ставяць лайкі або каментуюць выпускі. За што ім вялікі дзякуй!

— Вам ужо давялося паўдзельнічаць у якіх-небудзь конкурсах?

— Безумоўна, бо гэта выдатная магчымасць расказаць пра свой праект шырокай аўдыторыі, магчымасць адшукаць аднадумцаў і, калі вельмі пашанцуе, будучых партнёраў. Гэта наша мэта, таму заўсёды ўважліва адсочваем цікавыя конкурсы і канферэнцыі. Напрыклад, мы прымалі ўдзел у міжнародным студэнцкім конкурсе бізнес-праектаў «Invest Weekend», Міжнароднай універсіядзе МДУ імя М.В. Ламаносава па журналістыцы, рэспубліканскай студэнцкай навукова-практычнай канферэнцыі «Ініцыятыва і дзейнасць студэнцтва: ад кіравання да самакіравання» і іншых. Вельмі прыемна не толькі абараняць свой праект, але і быць заўважаным і адзначаным публікай, таму мы з павагай ставімся да кожнай узнагароды, уручанай «Inter'Актыву». Для супрацоўнікаў радыё яны — крыніца натхнення і павышэння энтузіязму, добры стымул, каб рухацца далей, пастаянна працаваць над сабой і ўдасканальвацца.

— Якія ў вас планы на будучыню?

— Не вельмі любім мы гэтае слова. Лічым за найлепшае бачыць перад сабой перспектывы. Студэнцкая радыёстанцыя «Inter'Актыў» у будучыні магла б стаць самастойнай FM-станцыяй, якая будзе скіравана на задавальненне інфармацыйных патрэб моладзі з розных устаноў адукацыі Гродзенскай вобласці — школ, каледжаў, універсітэтаў. Яна магла б праводзіць фестываль «Будзь у актыве!», на якім члены журы разгледзяць самыя цікавыя і актуальныя маладзёжныя праекты, скіраваныя на вырашэнне экалагічных, сацыяльных, культурных і іншых пытанняў. Як бачыце, наперадзе яшчэ шмат працы, але мы гатовы да ўсіх цяжкасцей, таму што вельмі любім сваю справу!

Таццяна ЛАУШ, студэнтка ІІ курса факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму ГрДУ імя Я. Купалы.

Агульная праца аб'ядноўвае.

Друкуецца ў «Нёмане»

Марка ляжала перада мной на стале. Што цяпер было? Не магу ўцяміць. Як успамін, далёкі і дзіўны, які навявае сум...

Так, стоп.

Я забіў Юлю.

Я ясна памятаю кожны ўдар, што нанёс ёй!

Божа!

Палец імгненна набраў на клавіятуры сем лічбаў.

Гудок, потым яшчэ адзін і яшчэ.

— Алё! Мілы?

— Юля? Ты... жывая?

— Леў! Ты зноў абкурыўся? Ты зноў?

— Не, не, усяго толькі сон!

— Ты за дурніцу мяне трымаеш?

— Клянуся, Юлечка, я яшчэ нічога не еў! Я так рады, што ўсё ў парадку! — я і праўда быў нечувана рады.

— Добра. Што прысніў хоць?

— Ды ўжо не важна! Чым ты займаешся? — я памяняў тэму.

Яшчэ пяць хвілін размовы.

Дзіўная справа. Што ўсё гэта магло значыць? Трэба пачакаць з наркотыкамі. У будучыні.

Марка зручна лягла пад язык.

Насенне датуры разжоўваліся з хрустам, абліваючы рэцэптары языка горыччу.

У прыродзе ўсё, што горкае, атрута.

За акном вялізнымі камякамі падаў снег.

Увесь мой пад'езд завалены рыбамі. Сотні, сотні рыб, якія скачуць і бязгучна разяўляюць раты, сотні слізкіх, смярдзючых рыб. Адна з іх, самая прадстаўнічая, у цыліндры, з палкай і маноклем, заявіла мне:

— Леў! Людзі сапсавалі ўсю ваду ў Чыжоўскім вадасховішчы, і таму мы будзем жыць у цябе!

Спачатку я крыху збянтэжыўся.

— Добра, заходзьце.

Уздыбіўшыся, як хваля, паток рыб заваліўся ў маю кватэру, умомант запоўніўшы ўсю прастору.

— Леў, Леў! — галоўная рыба тузала мяне плаўніком за штаніну. — Але ў цябе няма вады! Леў, выкліч нам таксі! Мы пойдзем шукаць іншае месца!

Я паслухмяна ўзяў трубку і набраў нумар. Дыспетчар выслухала мой адрас і сказала, што таксі будзе праз дзесяць хвілін.

Калі я закончыў размову, рыбы ўжо зніклі.

Я падумаў, што было б нядрэнна прыняць душ.

Але ён аказаўся заняты. Дзяўчына неверагоднай прыгажосці мылася там, напяваючы сабе пад нос нейкую песеньку.

Аўтар нарадзіўся ў 1990 годзе ў Мінску, дзе і скончыў СШ №77. Са школьных часоў захапляецца літаратурай, пісаў вершы і навелы. У 2009 годзе скончыў каледж дэкаратыўна-прыкладных мастацтваў па спецыяльнасці «Разьба па дрэве». Пасля службы ў арміі паступіў у Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка на спецыяльнасць «Псіхалогія». Апавяданні аўтара друкаваліся ў часопісе «Нёман».

Станіслаў ДЗЯРКАЧ

ЛЕЎ

УРЫВАК З АПАВЯДАННЯ

— О, Лёва! — сказала яна, убачыўшы мяне. — Ты ведаеш, хто я?

— Хто? — здзіўлена спытаў я.

— Датура, Лёва. Я цябе яшчэ доўга не пакіну. Давай паспрачаемся, што я засуну ў рот больш ватных палачак, чым ты?

Мною авалодаў проста неверагодны азарт.

— Давай! — крыкнуў я, ужо набіваючы рот палачкамі.

Яна рассмяялася. Раптам яе смех ператварыўся ў неверагодны шум, выбух! Мабыць, з такім гукам ствараўся сусвет.

Я сядзеў, прыхіліўшыся да абвугленага ствала некалі магутнага дрэва. Прама перада мной сядзеў леў. Ён выглядаў змучаным і знясіленым, яго поўсць ужо не блішчала пад сонцам.

Ён сядзеў і ўважліва глядзеў на мяне. Яго позірк быў асэнсаваным, і можна было падумаць, што перада мной разумная істота.

Леў няскладна працягнуў мне сваю лапу.

Я асцярожна, марудна дакрануўся да яе ўказальным пальцам.

Цемра.

***

Марка ляжала перада мной на стале. Мне хацелася плакаць. Мусіць, я пачаў вар'яцець. Вельмі шмат наркотыкаў. Вінт змяняецца маркамі, маркі — фенам, фен — грыбамі. Наркаманскі марафон даўжынёю ў жыццё.

Я ўскочыў са стула, у паніцы перакуліўшы яго на падлогу.

— Не, не! — гучна сказаў я.

Больш я не пападуся. Я не з'ем марку, не дакрануся і да насення дурману.

Страх авалодаў мною. Халодны хваляй ён пракаціўся па маім целе, засяродзіўшы свае сілы дзесьці ўнізе жывата. Усё цела білі дрыжыкі.

Я сутаргава схапіў тэлефон. Куды званіць? «Хуткая»? Патэлефанаваць маме? Не, мама не павінна ведаць. Пазваніць Юлі? Яна кіне мяне, калі даведаецца.

Я расплакаўся. Мае ногі раптам падкасіліся, і я ўпаў на падлогу, пакрытую старым, шорсткім дываном.

Найгоршы з магчымых кашмараў. Пальцы набралі «103».

— Прывітанне! Нумар два вас слухае. Чым мы можам вам дапамагчы?

— Мне тэрмінова патрэба «хуткая», — зрывістым голасам вымавіў я.

— Што менавіта ў вас здарылася?

— Перадазіроўка наркотыкамі, калі ласка, прыязджайце хутчэй!

— Дыктуйце адрас.

Рады, што «хуткая» ў нашым горадзе прыязджае хутка. Усяго дзесяць хвілін, і я чую званок у дамафон.

— «Хуткую» выклікалі? — хрыплы голас з трубкі.

— Выклікаў. Пяты паверх.

Я сеў у крэсла, пачаў позіркам гіпнатызаваць гадзіннік. Хвіліна. Яшчэ адна, потым яшчэ і яшчэ. Дзесяць хвілін... колькі ў мяне ў пад'ездзе прыступак? Няўжо можна падымацца так доўга?

Я адчуў, што ў маім кулаку штосьці ёсць. Раскрыўшы далонь, я ўбачыў на ёй горку датуры і марку з хітра прыжмураным тварыкам Барта Сімпсана.

Маленькая стрэлка паказвала на лічбу дванаццаць, значыць, мінула ўжо гадзіна. Урачы чамусьці не дайшлі да мяне.

Раптам мною авалодаў ледзяны спакой. Я ведаў, што абсалютна кантралюю сітуацыю і ніякая сіла не зможа выбіць мяне з каляіны.

З крывой ухмылкай я закінуў марку пад язык. Праз хвіліну ў роце апынулася і чорнае насенне, абпальваючы язык горыччу, з лёгкім макавым прысмакам.

Званок у дзверы.

Па той бок — няголены ўрач «хуткай дапамогі» няўцямна глядзіць на дзверы.

Шчаўчок замка.

— Доўга ж вас не было, — кажу яму я.

— Малады чалавек, мы размаўлялі па дамафоне хвіліну назад. Што вы прымалі?

— Датуру і ЛСД. Толькі што, дарэчы. Напэўна, дарэмна я вас выклікаў. Усё ў парадку.

Раптам да мяне пачаў даходзіць увесь абсурд сітуацыі. Я ўспомніў, як панікаваў гадзінай раней, а цяпер кажу ўрачу выкліканай мной «хуткай», што прыняў наркотыкі, але адчуваю сябе цудоўна і дапамога мне не патрэбна.

Ідыятызм.

— Дарэчы, а чаму вы адзін?

Урач паглядзеў на мяне вельмі ўважліва.

— Ахам мрыціух*, — сказаў урач, паглядзеўшы на мяне сваім адчужаным поглядам.

— Што?

Ён махнуў рукой, я толькі ўлавіў лёгкі рух. Агонь апёк маё горла найтанчэйшай паласой, прачарціўшы лінію з правага боку на левы. Мае ногі падкасіліся, і я ўпаў на калені.

Што са мной адбываецца? Чаму мае грудзі залівае столькі крыві?

Я паспрабаваў зрабіць сутаргавы ўдых. Я адчуў, як частка майго горла нібыта з'ехала ўніз, раскрылася, а затым пачуўся хлюпаючы гук, і ўнутр мяне рванулі патокі пякучага болю.

Я ўпаў на падлогу, здаецца, маё цела трэсла. Я бачыў перад сабой ногі забойцы, гэтага ўрача з дзіўным позіркам.

— Ахам мрыціух, — зноў пачуў я. Боль ужо дасягнуў макушкі, дасягнуў кончыкаў пальцаў.

Раптам усё заціхла. Штосьці цёплае спускалася з макушкі ўніз, да ног. І штосьці цёплае падымалася ўгору, да макушкі...

Неверагодны выбух!

Дзе я?

Пераклад з рускай Вольгі ЦЫБУЛЬСКАЙ.

* Ахам мрыціух (санскр.) — Я ёсць смерць.

З пошты ЧЫРВОНКІ ЧЗ

ПА ЗАКЛІКУ СЭРЦА

Арцём БАГДАНОВІЧ, вучань 8 класа Дакурнішскага вучэбна-педагагічнага комплексу — яслі-сад — сярэдняя школа Ашмянскага раёна:

«Быць добрым трэба ў першую чаргу самому — з любоўю адносіцца да бацькоў, блізкіх, людзей сталага ўзросту. Добрыя справы пачынаюцца з таго, каб саступіць месца бабулі ці дзядулю ў транспарце, перавесці іх праз дарогу, дапамагчы паднесці сумкі. Не забывацца наведваць сваіх родных, часцей пісаць і тэлефанаваць.

Зараз вельмі многім патрэбна дапамога і падтрымка з боку навакольных людзей. У гэтым я пераканаўся на ўласным вопыце, калі стаў валанцёрам. Хаця атрад налічвае ўсяго дзевяць чалавек і яго ўдзельнікам толькі па 13 гадоў, мы імкнёмся зрабіць жыццё школы і аграгарадка цікавым і разнастайным, напоўніць іх важнымі і карыснымі справамі. Мы з аднакласнікамі стараемся наведваць былых настаўнікаў школы — ветэранаў педагагічнай працы. Камусьці неабходна добраўпарадкаваць тэрыторыю, некаму дапамагчы па гаспадарцы — мы заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу. А хтосьці проста рады сустрэчы з намі дзеля прыемных стасункаў, цёплых успамінаў пра нейкія моманты свайго жыцця. Заўсёды рад нам удзельнік Вялікай Айчыннай вайны Сямён Фёдаравіч Давыдаў.

Што ж падштурхоўвае дзяўчат і хлопцаў дапамагаць іншым? Для нас адказ адназначны: мы займаемся валанцёрскай дзейнасцю па закліку сэрца. Мае аднакласнікі аказваюць дапамогу бескарыслівa, проста таму, што хтосьці ўсміхнецца ў адказ або скажа ціхае «дзякуй». Мне падабаецца больш аддаваць, чым браць. І ад гэтага пачуцця становіцца цёпла на душы».

НАСТРОЕНАЯ НА ПЕРАМОГУ

Дар'я ЦАУНЯ, Марыя ДАРАШКЕВІЧ, студэнткі I курса Інстытута журналістыкі БДУ:

«...Яна стаіць на борціку, гатовая скокнуць у ваду. Ва ўсім целе напружанне. За спінай — месяцы трэніровак, а наперадзе — некалькі секунд барацьбы і нястрымнае жаданне перамагчы. З такімі думкамі выходзіць на старт майстар спорту па плаванні і па сумяшчальніцтве наша аднакурсніца Кацярына Раманоўская.

Дзяўчына прыгадвае, што неаднойчы ёй хацелася ўсё кінуць, але побач былі людзі, якія падтрымлівалі. Асабліва мама. Бацькі ўвогуле ніколі не прымушалі, яна сама выбірала, чым займацца.

У восьмым класе ў жыцці Каці наступіў пераломны момант: за паўгода яна атрымала першы разрад і званне кандыдата ў майстры спорту, а праз год ужо была майстрам спорту.

Дзяўчына расказвае, што вучыцца ў спартыўным класе было весела. «Гэта не проста клас, мы — каманда, нягледзячы на тое, што плаванне — індывідуальны спорт. Аднакласнікі за некалькі гадоў сталі мне як родныя. Мы разам ездзілі на спаборніцтвы, і адпачывалі разам».

Па словах Каці, больш за ўсё ёй спадабалася ў Францыі. Дзяўчына прыгадвае, што вельмі хвалявалася, але старалася кантраляваць свае эмоцыі. Каця заняла адно першае і два трэція месцы! Гэта былі непередавальныя адчуванні! А пасля цяжкіх спаборніцтваў збылася дзіцячая мара: яна трапіла ў Дыснейлэнд.

Чаму Кацярына вырашыла звязаць сваё жыццё з журналістыкай? Кажа, што гэта было яе марай з дзяцінства. Заўсёды любіла быць у цэнтры падзей, складала вершы, пісала апавяданні. Была вельмі актыўнай і дапытлівай. «Калі паступіла ў Інстытут журналістыкі БДУ, ні разу не пашкадавала аб сваім выбары».

Лісты чытаў Сяргей РАСОЛЬКА.

Запрашальнік

«МАЛЮНКІ НА ШПАЛЕРАХ»

У сталічнай галерэі «Ў» адкрылася выстава дзіцячых твораў

Рабочая група праекта (Соф'я Садоўская, Ірына Лукашэнка, Вольга Мжэльская і Паліна Сей) падрыхтавала для дзетак 7-12 гадоў шэраг майстар-класаў, на якіх яны змаглі ў даступнай форме даведацца пра гісторыю сучаснага мастацтва, а таксама навучыцца выказваць свае ідэі, выкарыстоўваючы разнастайныя матэрыялы і тэхнікі прыкладной творчасці. Цягам трох месяцаў дзеткі дазнаваліся пра мастацтва з кароткіх лекцый і ладзілі свой уласны дыялог з працамі вядомых мастакоў, шукалі крыніцы натхнення. Дзеці даследавалі розныя тэхнікі і тэмы. У якасці адукацыйнай асновы рабочая група выбрала педагагічныя ідэі вядомай школы дызайну і архітэктуры «Баўхаус».

Школьныя праграмы па выяўленчым мастацтве ўцісквaюць дзяцей у рамкі, якія не надта адпавядаюць патрэбам узросту. У дадатак педагогі вымушаныя ацэньваць малюнкі, якія немагчыма і нельга ацэньваць. Часта ацэньванне і адзнакі адбіваюць у дзяцей усялякае жаданне браць пэндзаль у рукі. У гэтым узросце важнае не столькі ўменне выстраіць кампазіцыю, выбраць колеры або рэалістычна выявіць аб'ект: каштоўнасць працы не ў канчатковым выніку, а ў самім працэсе стварэння.

Што маляваў малы Пікаса на шпалерах? Ці ляпіў пясочныя бабкі Радэн? Калі Паўль Клее ўпершыню ўзяў у рукі аловак? Гэтыя гісторыі, на жаль, не захаваліся ў архівах. Маляваць для дзетак гэтаксама натуральна, як пачаць хадзіць, размаўляць і лазіць па дрэвах — гэта форма пазнання свету.

«Баўхаус» быў абраны тэмай курсу дзякуючы адметным адукацыйным напрацоўкам некаторых педагогаў гэтай школы. У прыватнасці, практыкаванням Ёганеса Ітэна, якія спрыяюць не толькі развіццю навыку візуальнага ўспрымання, але і разважанням пра яго сутнасць, не заўжды бачную воку. Як казаў Паўль Клее, «мастацтва не выяўляе бачнае, але робіць бачным». Задачай педагогаў было не навучыць дзетак маляваць, а абудзіць у іх жаданне ствараць.

Выстава будзе дзейнічаць да 14 чэрвеня. А 6 і 7 чэрвеня ў яе рамках пройдзе дзіцячы экалагічны фэст «Зялёны weekend», арганізаваны таварыствам «Зялёная сетка». Цягам двух дзён у галерэі адбудуцца разнастайныя тэматычныя лекцыі, паказы мультфільмаў і кінастужак, багата захапляльных творчых майстар-класаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Будзь у курсе!

МЕДЫЦЫНСКІЯ БАР'ЕРЫ ДЛЯ ЗАМЕЖНЫХ ГРАМАДЗЯН

Міністэрства аховы здароўя зацвердзіла пералік супрацьпаказанняў да навучання ў Беларусі замежных грамадзян і асоб без грамадзянства. У яго ўвайшлі 23 пазіцыі.

Не атрымаюць дазвол на вучобу ў нашай краіне замежныя грамадзяне, хворыя на актыўны туберкулёз розных органаў і сістэм, на сіфіліс і ганарэю, людзі з лёгачна-сардэчнай недастатковасцю любой этыялогіі III стадыі, хранічнай сардэчнай недастатковасцю любой этыялогіі II Б і III стадыі, хранічнымі захворваннямі нырак і тэрмінальнай нырачнай недастатковасцю, цырозам печані ў тэрмінальнай стадыі, цукровым дыябетам I тыпу, ускладненым дыябетычнай нефрапатыяй, з вострымі і хранічнымі лейкозам, апластычнай анеміяй.

У спіс увайшлі таксама халера, гемарагічныя ліхаманкі Марбург, Эбола, Ласа, сібірская язва, чума і цяжкія, хранічныя інвалідызуючыя захворванні скуры.

Не змогуць атрымліваць адукацыю ў Беларусі людзі з псіхічнымі расстройствамі рознай этыялогіі, з расстройствамі асобы і паводзінаў, у тым ліку з залежнасцю ад псіхаактыўных рэчываў, з шызафрэніяй, вострымі і транзіторнымі псіхатычнымі расстройствамі, афектыўнымі расстройствамі, эпілепсіяй з частымі прыпадкамі і гэтак далей. Поўны спіс супрацьпаказанняў можна паглядзець на сайце Міністэрства адукацыі edu.gov.by у рубрыцы «Актуальна».

Надзея НІКАЛАЕВА.

SEX=БАЛЯСЫ

ШАРМУ — АД ПУЗА!

Ну вось і перажыла краіна чарговае «Еўрабачанне»... Жыццё пакрысе зноў наладжваецца, уваходзіць у спакойнае рэчышча... Тым больш напярадзе — такое доўгачаканае лета. Дарэчы, вы заўважылі, як змяніліся вуліцы нашых гарадоў і вёсак з першымі павевамі цяпла, калі ўсе нарэшце распрануліся? На іх з'явіліся тысячы маладых і прыгожых... Не, не жанчын — досыць гэтых гендарных стэрэатыпаў. Мужчын. Якія, як ніколі раней, сустрэлі чарговы летні сезон у «поўным узбраенні». Як, вы не разумееце, пра што гаворка? Не чулі гэтую навіну? Новы трэнд года, які імкліва набывае сусветную папулярнасць, — невялікі пузік у прадстаўнікоў моцнай паловы чалавецтва. Так-так, вы ўсё правільна зразумелі: не кубікі натрэніраванага прэса, а такі невялічкі «піўны мазалёк» (вядома, пенны напой неабавязкова можа быць яго прычынай). Алілуя! Мабыць, так усклікнулі тыя з мужчын, якія любяць па выхадных займацца нерухомасцю. У сэнсе, ляжаць на канапе і не рухацца. («І што такое на мяне ўчора найшло? Перад халадзільнікам дагэтуль сорамна».)

Усё пачалося з таго, што ў інтэрнэце з'явіўся артыкул амерыканскай студэнткі. Дзяўчына неабачліва напісала пра асаблівую прывабнасць мужчын з жыватом, якія не вельмі моцна сочаць за сабой. Не тое, каб гэта было сапраўднае абвіслае піўное пуза, а, як яна адзначыла, прыемны баланс паміж ім і пляскатым жыватом. («У цябе прыгожая лінія падбародка». — «Дзякуй. Я многа жую».) Такая фігура, на думку аўтаркі, гаворыць пра тое, што хлопец усё ж час ад часу займаецца ў трэнажорнай зале, аднак не робіць з гэтага культу, не імкнецца да нейкай фізічнай дасканаласці. Наадварот, ён можа ў сваё задавальненне дазволіць у выхадны

Фота Надзеі БУЖАН.

дзень з'есці вялікую піцу і не турбавацца, што паправіцца. («Брытанскія вучоныя высветлілі, што маленькія талеркі ратуюць ад пераядання. Але толькі лянівых і някемлівых».) «Такога спадарожніка, — развівае далей сваю тэорыю студэнтка, — прыемна абдымаць, з ім камфортна вячэраць». («Хачу, каб хто-небудзь прымушаў мяне да дзеянняў сексуальнага характару, пагражаючы гарачай зброяй. Пажадана — галубцамі са смятанай».)

Маладая каляжанка (між іншым, інструктар па фітнесу ў вольны ад асноўнай працы час) напачатку не паверыла навіне пра новы трэнд. А калі пераканалася, што гэта не падман, першай яе рэакцыяй было: «А фота аўтаркі артыкула ёсць? Можа, яна не вельмі прыгожая і такім чынам «заніжае планку»?» («Жаночая мудраць у сукупнасці з жаночай хітрасцю даюць такі эфект, які не можа даць ніводная вышэйшая адукацыя».) І мела рацыю! Фотаздымка амерыканскай студэнткі мы не знайшлі. Але аўтарка тэорыі прызналася, што выгляд мужчыны з пузікам лічыць ідэальным, таму што побач з такім спадарожнікам дзяўчыне не трэба самой выглядаць бездакорнай. («Гэты непрыемны момант... Ты, які кінуў курыць, цішком уначы крадзешся на кухню, каб пакурыць у фортку, і сустракаеш жонку, якая села на дыету, каля адкрытага халадзільніка з батонам каўбасы ў руках...») Так ужо павялося, што часта жанчыны хочуць глядзецца прыгажэйшымі за сваіх мужчын, каб адчуваць сябе больш упэўнена. Пры гэтым менавіта хлопцы з пузікамі дапамагаюць звыкнуцца з тым, як яны будуць выглядаць у сталым узросце, і не падманваюць часовай падцягнутасцю. Дарэчы, тая ж каляжанка праз некалькі дзён са здзіўленнем у голасе канстатавала, што амаль ва ўсіх яе сябровак бой-фрэнды менавіта такога «топавага» тыпажу. Бачыце, нашы дзяўчаты яшчэ раней ацанілі ўвесь шарм «брэндавых» хлопцаў!

Пажартаваў, вядома. Але, думаю, доля ісціны ў тым ёсць. Інакш чаму мог узнікнуць новы трэнд, чаму ён так хутка набыў папулярнасць, што яго абмяркоўваюць у вядучых сусветных сродках масавай інфармацыі? У сеціве пачалі нават складаць адмысловыя топ-рэйтынгі славутасцяў, якіх можна назваць «іконамі новага стылю». Гэта, напрыклад, Леанарда Дзі Капрыа, Расел Кроў, Адам Сэндлер — вядомыя галівудскія «зоркі», якія за апошні час абзавяліся «піўнымі пузікамі». Але не будзем цешыць сябе тым, што адгадаваў жывоцік — і ты на іх узроўні. («Сціпласць упрыгожвае мужчыну. Але сапраўдны мужчына ўпрыгажэнняў не носіць».) Тут, прабачце, яшчэ і талент мець трэба. З іншага боку, магчыма, дзяўчаты стаміліся ад таго, што хлопцы пачалі занадта шмат часу надаваць самім сабе і сваёй знешнасці. Гэтую версію патрымаў адзін з калумністаў, які распавёў, што цягам дзесяці гадоў не вылазіў з трэнажорнай залы, аднак бездакорная форма не толькі не зрабіла яго больш прывабным для жанчын, але нават пачала адпужваць іх. Яны маглі бясконца хваліць біцэпсы, але не імкнуліся да доўгатэрміновых адносін з мужчынам. («Людзі, якія па выхадных прачынаюцца ў шэсць, едуць на велапрагулкі, пікнікі... Вы што ўжываеце? Я ледзьве ўстаю з ложка, і тое пасля абеду». Затое потым... «Я выспаўся. Цяпер я бяспечны для грамадства».)

Гэта ніякае не апраўданне ляноты і нежадання займацца спортам. («Найлепшы спосаб падняць чалавека ранкам — гэта кава ў ложак. Выліў — і ўцякай!».) Паслухайце песню Сямёна Слепакова «Мора работы», дзе ёсць словы «праца працай, але час ад часу трэба працаваць». Вось я зараз дапішу гэтыя радкі і... «Адкрылася самая вялікая трэнажорная зала... Агарод!» Галоўнае — не страціць на ім свой шарм зусім!..

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«Пераможца ніколі не здаецца»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Цяпер я жыву адна і дома мяне ніхто не чакае. Я яшчэ не сустрэла свайго чалавека. Хлопец, якога я ўяўляю побач з сабой, павінен быць упэўненым у сабе і ведаць, чаго ён хоча дасягнуць у жыцці. Немалаважна і тое, каб ён падтрымліваў мяне ў імкненні займацца любімай справай. Мне патрэбен той, хто стане маёй «каменнай сцяной».

Пакуль што, прызнаецца юная спявачка, часу хадзіць на спатканні зусім няма. Дзяўчына сумяшчае вучобу ва Універсітэце культуры і мастацтваў з працай у Нацыянальным аркестры Міхаіла Фінберга (жыццё там — гэта пастаянныя рэпетыцыі, гастролі), а цяпер яшчэ і рыхтуецца да «Славянскага базару».

— Скажы, а як ты расцэньваеш для сябе перамогі на конкурсах?

— Заўсёды адказна рыхтуюся і настройваюся на добры вынік. Але калі ўдаецца заваяваць першае месца ці гран-пры, то заўсёды прысутнічае момант прыемнага здзіўлення. А наогул мой дэвіз па жыцці: пераможца ніколі не здаецца. Імкнуся да сур'ёзных вынікаў, але не загадваю, што атрымаецца. Наогул, талент ніколі не гарантуе поспеху, таму што важна, колькі ты гатовы працаваць дзеля яго.

Наўрад ці магла Валерыя некалі прадбачыць сваю перамогу на рэспубліканскім конкурсе маладых выканаўцаў «Маладзечна—2013». Аднак узяла гран-пры, і яе заўважыў Міхаіл Фінберг, запрасіўшы супрацоўнічаць. Музыкай пачала займацца, як і многія, у дзяцінстве. Спачатку ў ансамблі народнай музыкі «Ярыца», потым у Магілёўскай дзяржаўнай гімназіі-каледжы мастацтваў. Быў нават час, калі дзяўчына наведвала Студыю Сяргея Нагорнага, спасцігаючы ў яе сценах акцёрскае майстэрства, харэаграфію і іншыя дысцыпліны.

— Яшчэ задоўга да таго, як пачала вывучаць нотную грамату, спрабавала спяваць і цягнулася да фартэпіяна. Уяўляла сябе артысткай. Нават на дачы збірала бабуль, дзядуляў і іх унукаў і ладзіла ім імправізаваныя канцэрты. А мая маці, заўважыўшы такі інтарэс да музыкі, аддала мяне ў ансамбль. Быў перыяд, калі ў пятым класе я прыйшла ў гімназію, а там былі дзеці, якія да гэтага ўжо на працягу пяці гадоў вывучалі сальфеджыа і іншыя дысцыпліны, і я за два гады змагла дагнаць іх. Праўда, з той пары вольнага часу амаль не было.

— Кажуць, што дысцыпліна і творчасць не заўсёды сумяшчальныя. Ты — прыклад, які абвяргае такое меркаванне?

— Што датычыцца дысцыпліны, то ў гэтым вялікая заслуга Міхаіла Якаўлевіча Фінберга. У нас вельмі жорстка караюцца спазненні на канцэрт і рэпетыцыі. Наогул дысцыпліна — гарант добрай працы. Я вельмі ўдзячная свайму кіраўніку за тое, што ён верыць у мяне і падтрымлівае.

— Як сябры рэагуюць на тваё захапленне музыкай?

— У мяне мала сяброў. Але тыя, хто са мной ідзе па жыцці, ставяцца да гэтага з разуменнем, і ніхто не крыўдзіцца, калі, скажам, з-за чарговага конкурсу я не магу прыйсці на чыйсьці дзень нараджэння.

— А твая малодшая сястра, гледзячы на цябе, не кажа бацькам пра жаданне займацца музыкай?

— Кіра — мая самая адданая прыхільніца, яна ведае на памяць усе мае песні. І сама чыста спявае. Айчым сказаў неяк, што нам і адной спявачкі ў сям'і дастаткова. Аднак, калі мы з сястрой сустракаемся, то вельмі любім і спяваць, і танцаваць пад гучную музыку, чытаем разам кніжкі...

Некалі хацела брата. Памятаю, калі даведалася, што будзе сястра, то моцна пакрыўдзілася на бацькоў і тыдні два, мабыць, з імі не размаўляла. Цяпер жа нават не ведаю, як бы я жыла без яе. Думаю, калі яна падрасце, мы станем найлепшымі сяброўкамі. А можа і яна пойдзе маім шляхам.

«Яшчэ задоўга да таго, як пачала вывучаць нотную грамату, спрабавала спяваць і цягнулася да фартэпіяна. Уяўляла сябе артысткай. Нават на дачы збірала бабуль, дзядуляў і іх унукаў і ладзіла ім імправізаваныя канцэрты».

— Для сябе ты бачыш перспектыву толькі на сцэне?

— Так. І нават не ўяўляю, чым бы яшчэ магла займацца. У школе я мела здольнасці да вывучэння замежных моў, таму, магчыма, разглядала б яшчэ такі варыянт. Дзядуля мой хацеў, каб я паступіла на міжнародныя адносіны, а ў выніку я выбрала музыку... У мяне маці вельмі творчы чалавек, хоць і працуе ўрачом. Калі танцавала ў ансамблі, то часта брала мяне на рэпетыцыі. Яна ў мяне артыстка яшчэ тая! Я хацела б навучыцца ў яе ўменню падаваць сябе на сцэне, бо сёння я толькі ў пошуку сябе.

— Да публічнасці, якая з'яўляецца неад'емнай часткай жыцця артыстаў, ты гатова?

— Мець жыццё, дзе ты цікавы іншым і твой час распісаны па гадзінах, — адна з маіх мар. Сказаць, ці гатова я да такога раскладу, мабыць, не змагу, пакуль не адчую наступстваў. Як і ўсім артыстам, мне хочацца быць запатрабаванай у публікі і стаць годнай артысткай, каб мая музыка была цікавая людзям, каб яны пачулі мае гісторыі...

Алена ДРАПКО.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.117.
Нумар падпісаны ў 19.30 03.06.2015 г.

ПАДАРОЖЖА ПАЧЫНАЕЦЦА!

Новы праект будзе садзейнічаць развіццю турыстычнага патэнцыялу нашай краіны

«Belarus N» — гэта памочнік, які павінен ператварыць «Невядомую» і адкрыць свету «Новую Беларусь», дзякуючы яму вандроўнікі змогуць даведацца шмат цікавага пра нашу краіну.

Праект, як і многія падарожжы, пачнецца з аўтазаправачных станцый — штодзённа 540 АЗС, што ўваходзяць у склад аб'яднання «Беларуснафта», наведваюць больш за 350 тысяч аўтамабілістаў. Таму менавіта АЗС і стануць сапраўднымі інфармацыйнымі і экіпіровачнымі цэнтрамі, дзе можна будзе атрымаць звесткі пра турыстычныя маршруты праекта «Belarus N» і іх аб'екты (аграсядзібы, музеі, цікавыя мясціны, што знаходзяцца недалёка ад АЗС), а таксама забраніраваць і аплаціць будучае падарожжа. Кожны маршрут будзе мець свой тэматычны напрамак, які таксама знойдзе адлюстраванне ў знешнім і ўнутраным афармленні АЗС.

Да ўдзелу ў ім запрашаюцца прадстаўнікі органаў улады, турыстычнай сферы, буйныя прамысловыя прадпрыемствы, гаспадары аграсядзіб Беларусі, якія імкнуцца развіваць у сваіх рэгіёнах сферу культурнага і агратурызму, паслуг, гасцінічнай і рэстараннай справы і іншыя напрамкі.

Як адзначыў **намеснік генеральнага дырэктара арганізацыі «Беларуснафта» Сяргей КАМОРНІКАЎ,** наша краіна валодае велізарным турыстычным патэнцыялам: шматвекавая гісторыя, і кулінарныя традыцыі, і цікавыя мясціны, і славутасці. «Мы таксама выступаем за здаровую і актыўную Беларусь і жадаем, каб падарожжы па краіне сталі новай карыснай звычкай нашых грамадзян», — сказаў ён.

У найбліжэйшы час арганізатары праекта плануюць стварыць турыстычны інтэрнэт-партал з рэйтынгам тэматычных маршрутаў і месцаў адпачынку, сістэмай анлайн-браніравання і аплаты паслуг, а таксама распрацаваць мабільную праграму для вандроўнікаў і сувенірны каталог для распаўсюджання ў сетцы АЗС «Беларуснафта».

Першыя маршруты павінны запрацаваць ужо ў канцы чэрвеня — пачатку ліпеня. Афіцыйны ж старт праекта плануецца ў кастрычніку бягучага года з адкрыцця сэрвісу анлайн-браніравання на сайце belarusn.by.

Вераніка КОЛАСАВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Молодечнопиво» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже

ТОРГОВОГО ПАВИЛЬОНА С НАВЕСОМ,

общ. пл. 36,7 кв.м (инв. № по бух. учету 0850), расположенного по адресу: Минская область, г. Молодечно.

Начальная цена с НДС – 45 000 000 бел. руб. Задаток 10% от начальной цены (4 500 000 бел. руб.).

Задаток перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 08.05.2015.

Порядок проведения аукциона регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенном на сайте организатора торгов **www.rlt.by**, а также иными актами законодательства.

Аукцион состоится **15.06.2015** в **12.00** по адресу: г. Молодечно, ул. Либава-Роменская, д. 143. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.06.2015** до **16.00** по адресу: г. Минск, улица Чкалова 5, каб. 324.

Тел.: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.

ЗАЛАТАЯ СЕРЫЯ НАШАЙ ЛІТАРАТУРЫ

У «Беларускім кнігазборы» за 20 гадоў выйшла 80 тамоў

Калі гэты выдавецкі праект толькі распачынаўся, мала хто верыў у яго паспяховую рэалізацыю. Занадта смелай і грандыёзнай здавалася навукоўцам, выдаўцам і пісьменнікам задумка паэта, перакладчыка, фалькларыста Кастуся Цвіркі аб падрыхтоўцы і выданні 200 кніг найлепшых твораў беларускай літаратуры, напісаных са старажытнасці і да нашых дзён. Але з часу заснавання залатой серыі «Беларускі кнігазбор» прайшло ўжо два дзесяцігоддзі, праект дэманструе сваю жыццяздольнасць і актуальнасць, а рэдактары і выдаўцы сёння прапануюць чытачам аж васьмідзясятую кнігу з ужо любімай многімі серыі.

Так, у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук прайшла прэзентацыя васьмідзясятага тома серыі «Беларускі кнігазбор» — кнігі выбраных твораў паэткі і перакладчыцы з Белаазёрска Ніны Мацяш. На вечарыну завіталі рэдактары, укладальнікі, выдаўцы і нават аўтары асобных тамоў серыі, каб разам з выхадам новай кнігі адзначыць 20-годдзе праекта.

Цяпер выпускам «Беларускага кнігазбора» апякуецца Выдавецкі дом «Беларуская навука». **Галоўны рэдактар гэтай установы Георгій КІСЯЛЁЎ** распавёў:

— Адметна, што дваццаць гадоў таму праект выйшаў са сцен акадэмічнай установы — Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. І вельмі сімвалічна, што праз некаторы час яго ажыццяўленне зноў вярнулася ў сцены акадэміі. На гэты раз — у Выдавецкі дом «Беларуская навука».

Галоўны рэдактар «Беларускага кнігазбору» Кастусь Цвірка прыгадаў, што першым томам, які выйшаў пад маркай серыі, стаў Збор твораў Яна Чачота, яго выпуск падтрымала колішняе Міністэрства культуры і друку краіны. Дзяржава прафінансавала і выданне некалькіх наступных кніг праекта. З гэтага часу стала прасцей шукаць мецэнатаў для падтрымкі справы: чытачы і выдаўцы ўжо атрымалі магчымасць пазнаёміцца з кнігамі серыі, ацаніць іх якасць і значэнне для культурнага жыцця краіны.

— Пра кожны том «Беларускага кнігазбору» можна напісаць сваю гісторыю: ад задумкі, распрацоўкі, рэалізацыі да рэакцыі чытачоў, водгуку крытыкаў. Некаторыя кнігі ў свой час сталі сапраўднымі сенсацыямі, хутка «разляцеліся» па бібліятэках і выклікалі шырокі рэзананс. Гэта, у ліку іншых, Збор твораў Кастуся Каліноўскага, надзвычай прафесійна падрыхтаваны Генадзем Кісялёвым, ці кніга тэкстаў Вацлава Ластоўскага, укладзеная Язэпам Янушкевічам. Думаецца, гэтыя тамы вартыя перавыдання, бо попыт на іх будзе і сёння, — мяркуе Кастусь Аляксеевіч.

Дарэчы, самі выдаўцы адзначаюць, што поспех той ці іншай кнігі, што выходзіць у межах праекта, прадбачыць вельмі складана. Так, сёння большай папулярнасцю карыстаецца проза і навукова-папулярная літаратура, але здараюцца «зорныя» прэм'еры і зборнікаў паэзіі. Напрыклад, кніга вершаў Валянціна Таўлая, выдадзеная летась да стагоддзя творцы, атрымала шырокі грамадскі рэзананс і прызнанне чытача.

Зрэшты, нельга назваць хаця б адзін з тамоў «Беларускага кнігазбору» нязначным, бессэнсоўным і незапатрабаваным. І прычыну поспеху патлумачыць вельмі проста: серыя трымаецца на энтузіязме, прафесіяналізме і глыбокіх ведах укладальнікаў, рэдактараў і выдаўцоў. Таму і план-праспект, які калісьці Кастусь Цвірка прапанаваў на разгляд акадэміку Віктару Каваленку, тагачаснаму дырэктару акадэмічнага Інстытута літаратуры, можна лічыць не проста задумкай кніжнай серыі, але і цэлай канцэпцыяй гісторыі развіцця айчыннай літаратуры. Больш за тое, над падрыхтоўкай тамоў працавалі і працуюць такія вядомыя і паважаныя даследчыкі, як Міхась Тычына, Лідзія Савік, Іван Саверчанка ды іншыя выдатныя навукоўцы, што нават не ўзнікае сумнення ва ўзроўні падрыхтоўкі кніг. Наадварот, самі даследчыкі адзначаюць, што пры напісанні артыкулаў, рэцэнзій, аглядаў перадусім шукаюць на паліцах томікі «Беларускага кнігазбору», бо менавіта ў гэтых выданнях, у прадмовах і каментарах да іх, можна знайсці сапраўды ўнікальныя звесткі і не выдадзеныя раней тэксты.

Але вернемся да васьмідзясятага тома серыі, толькі нядаўна ўпершыню прэзентаванага публіцы. Ён змяшчае выбраныя творы паэткі і перакладчыцы Ніны Мацяш, тут прадстаўлены ўсе жанры, у якіх працавала Ніна Іосіфаўна. Гэта вершы, паэмы, пераклады, эсэ, успаміны, артыкулы.... Выданне падрыхтавалі добрыя сябры паэткі Уладзімір Васілевіч і Галіна Скарына, прадмову напісаў Генадзь Праневіч. Асабліва вялікую ўвагу варта звярнуць на эпісталярную спадчыну паэткі, апублікаваную ўпершыню. Сябры, калегі-паэты ўспаміналі падчас вечарыны, што хоць было далёка, з задавальненнем ездзілі на Берасцейшчыну, у Белаазёрск, каб сустрэцца з Нінай Іосіфаўнай, паразмаўляць з ёй. Нават у калясцы, у якой паэтка правяла больш як трыццаць гадоў, яна выпраменьвала аптымізм, святло. Пэўна, падсілкаваннем для чытачоў стане і новая кніга выбраных твораў Ніны Мацяш.

80 тамоў «Беларускага кнігазбору», што пабачылі свет, — гэта далёка не ўся серыя. У смелых і амбітных планах выдаўцоў — падрыхтоўка новых тамоў твораў нашых класікаў: Ядвігіна Ш., Лукаша Калюгі, Уладзіслава Галубка, Уладзіміра Дубоўкі, Аркадзя Куляшова, Яўгеніі Янішчыц, Пімена Панчанкі, Максіма Танка. Залатая палічка нашай літаратуры можа папоўніцца і кнігамі сучаснікаў: Анатоля Сыса, Віктара Казько, Алеся Жука, Алеся Разанава, а таксама стаць магчымасцю вяртання з нябыту для такіх амаль невядомых аўтараў, як Адам Нарушэвіч, Юльян Нямцэвіч, Ева Фялінская, Павел Шпілеўскі, Уладзімір Самойла, Іван Ласкоў.

Таму нам застаецца толькі пажадаць 100 гадоў і шмат тамоў «Беларускаму кнігазбору»!

Марына ВЕСЯЛУХА.

7 июля 2015 г. **№1-С/2015**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже земельных участков в частную собственность в г. Гомеле

№ лота	Адрес земельного участка: г. Гомель	Кадастровый номер участка	Площадь, га	Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий. Инженерно-технические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ	Начальная цена, бел. рублей	Сумма задатка, бел. рублей	Затраты на подготовку документации, бел. рублей	Условия продажи объекта, целевое назначение
1	Ченковский проезд, 14 а	340100000008004645	0,0813	водоохранная зона водных объектов, охранная зона линий электропередачи – 0,0025 га, водоохранная зона водных объктов, охранная зона линий электропередачи, охранная зона сетей и сооружений канализации – 0,0040 га, водоохранная зона водных объектов, охранная зона сетей и сооружений канализации – 0,0017 га, водоохранная зона водных объектов – 0,0731 га	170 094 234	34 018 847	20 111 037	в частную собственность, для строительства и обслуживания одноквартирного, блокированного жилого дома (размещение объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме)
2	ул. Климовская, 7	340100000007006646	0,0633	Ограничений нет	103 408 146	20 681 629	19 191 815	
3	в границах улиц Надежды – Молодости	340100000002005548	0,1048	Ограничений нет	138 164 128	27 632 826	18 789 756	

1. Организатор аукционных торгов – Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).

2. Объекты выставляются на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Инженерное развитие инфроструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр», расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 2-й этаж, каб. 2-14.

3. **Аукцион состоится 7 июля 2015 г. в 15.00 в Гомельском городском исполнительном кометете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115** при наличии не менее двух участников на каждый лот.

4. К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, негосударственные юридические лица Республики Беларусь, подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» указанные в извещении сроки следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка в размере, указанном в извещении, с отметкой банка, на **р/с 3012203080014 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, МФО 151501912. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе.**

Кроме того, предоставляются:

4.1. гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

4.2. представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

4.3. представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

4.4. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц – документ, удостоверяющий личность. Граждане, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору аукциона затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона. Если заявление на участие в аукционе подано только одним гражданином или юридическим лицом, земельный участок предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

7. **Заявления с приложением необходимых документов для участия в торгах принимаются Государсвенным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 5 июня по 2 июля 2015 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 12.00, средам с 13.00 до 17.00 по 02 июля 2015 г. включительно по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 2-й этаж, каб. 2-14.** Заключительная регистрация зарегистрированных участников аукциона с 14.00 до 14.40 в день проведения аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. № 115.

КОНТАКТНЫЙ ТЕЛЕФОН: 41-97-86. Информация размещена на сайте: www.gorod.gomel.by

7 июля 2015 г. **№1-А/2015**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле

№ лота	Адрес земельного участка: г. Гомель	Кадастровый номер участка	Площадь, га	Целевое назначение – строительство	Качество земли	Наличие ограничений	Срок аренды (лет)	Начальная стоимость, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.	Расходы на подготовку докум-ции, бел. руб.
1	в районе усадебной застройки «Романовичи» (участок № **813** по генплану)	340100000008003066	0,0759	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме)	к землям сельскохозяйственного назначения не относятся	Охранная зона линий связи и радиофикации – 0,0022 га, охранная зона сетей и сооружений канализации – 0,0087 га, охранная зона линий связи и радиофикации, охранная зона сетей и сооружений канализации – 0,0003 га	5	4 331 746	866 349	14 150 607
2	в районе усадебной застройки «Романовичи» (участок № **303** по генплану)	340100000008002654	0,0848			Охранная зона линий связи и радиофикации – 0, 0027 га	5	4 839 686	967 937	13 012 045
3	в районе усадебной застройки «Романовичи» (участок № **1903** по генплану)	340100000008004174	0,0810			Охранная зона сетей и сооружений канализации – 0,0081 га	5	4 622 715	924 543	13 637 979
4	ул. Оськина вблизи позиции №41а (участок **№1** по генплану)	340100000007006628	0,0018	для установки легкотипного киоска для розничной торговли (нескоропортящейся пищевой продукции, промышленной группы товаров) или бытового обслуживания населения (земельный участок для размещения объектов неустановленного назначения)		Ограничений в использовании нет	5	1 024 160	204 832	19 242 858
5	ул. Оськина вблизи позиции №41а (участок **№2** по генплану)	340100000007006629	0,0018			Ограничений в использовании нет	5	1 024 160	204 832	19 242 858
6	ул. Оськина вблизи позиции №41а (участок **№3** по генплану)	340100000007006630	0,0018			Ограничений в использовании нет	5	1 024 160	204 832	19 242 858
7	ул. Оськина вблизи позиции №41а (участок **№4** по генплану)	340100000007006631	0,0018			Ограничений в использовании нет	5	1 024 160	204 832	19 242 858
8	проспект Октября, 22а	340100000006005132	0,0010			Ограничений в использовании нет	3	874 130	174 826	19 485 142

